В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

## 2

Частка 2



В. І. Свірыдзенка

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Нацыянальны інстытут адукацыі
2020

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.2=161.1)
ББК 81.2.2Беи-922
С24

Р э ц э н з е н т ы:

канд. пед. навук, дац., вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі пачатковай адукацыі Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь *М. Б. Анціпава*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 16 г. Мінска» (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, настаўнік пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст» *Ю. В. Бялова*)

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

**Завяжы вузялок!** — важная інфармацыя пра мову і маўленне (чытае настаўнік);


— дадатковае творчае заданне, якое выконваецца па жаданні;


— слоўнік;

— слоўнікавае слова;

**Рм** — заданне па развіцці маўлення;


— выкананне задання ў электронным дапаможніку: http://qrcode.by/3lo85;


— дамашняе заданне.

**ISBN 978-985-594-570-4 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-594-568-1**

© Свірыдзенка В. І., 2020
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020

Правообладатель Национальный институт образования

# ГУКІ І ЛІТАРЫ

## Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**1.** Вымавіце словы парамі. Якімі гукамі яны адрозніваюцца?

нос — нёс
воз — вёз
стол — столь
вугал — вугаль



***столь*** — рус. *потоло́к*

Якімі літарамі адрозніваюцца словы? Як перадаецца на пісьме мяккасць зычных гукаў?

Зычныя гукі бываюць цвёрдыя і мяккія. Мяккасць зычных гукаў на пісьме абазначаецца літарамі ***е, ё, ю, я, і, ь***: ***верасень, клён, ліпа, зязюля***.



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Прачытайце. Вымавіце выдзеленыя словы парамі. Якія гукі адрозніваюць значэнне аднаго слова ад другога?

Мой мядзведзік мае **моду**
перад сном паесці **мёду.**

А грыбоў жа ў **бары**!
Самі просяцца: **бяры**!

Зноў карась разводзіць **плёткі:**
— Шчупака пабілі **плоткі.**

*Н. Стаража ва.*



***разво́дзіць плёткі*** *— гаворыць няпраўду*
***ма́е мо́ду*** *— мае звычку*

Выпішыце выдзеленыя словы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.

**3.** Разгледзьце форзацы. Назавіце парныя цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Які гук [й’]? Які гук [ў]? Вымавіце словы *гара, гіра*. У якім слове гук [г] цвёрды, а ў якім — мяккі?



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** У радзе літар знайдзіце назвы рыб.

шчупакарплоткакунёкарась



*шч..к*



*пл..а*



*к..п*



*а..к*



*к..сь*

Запішыце гэтыя словы.

Назавіце словы з мяккімі зычнымі гукамі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі, разам з наступнай літарай.

У з о р: *акунёк*.

**5.** Прачытайце. Што трэба для рыбалкі?

Вось кручок, вось чарвячок,
Лёска, палка — і рыбалка.
Закідай хутчэй, Міхалка.

*У. Карызна.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

Сам з сябе смяецца сом,
сом прысніў са смехам сон.
*К. Камейша.*

Выпішыце словы, у якіх усе зычныя цвёрдыя. Назавіце словы, якія адрозніваюцца паміж сабой адным гукам.



**7.** Адгадайце загадку.




Хто жыве ў віры ля кручы,
паласаты і калючы,
мае крылы, хоць не птах,
а на рыб наводзіць жах?
*С. Кацуба.*



***вір*** *— глыбокае месца ў рацэ, дзе адбываецца завіхрэ́нне вады*
***кру́ча*** *— круты бераг*

Спішыце загадку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі, разам з наступнай літарай.


Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Прачытайце. Устаўце ў сказ словы з дужак.



**Чмель стаміўся, сеў на ... , адпачне і будзе ... (*лотаць, лётаць*). (*Н. Сторажава.*)**

*лотаць*

Якімі гукамі адрозніваюцца словы ў дужках? Якімі літарамі адрозніваюцца гэтыя словы?

*сусе́д*

**9.** Прачытайце верш.

**Люстэрка**

Ва ўсіх ры́бак-дзяўчат
карп люстра́ны — нарасхват.
Ці збіраецца **бяседа,**
ці гулянка ў **суседа** —
**модніцы** да карпа гужам:
ён люстэркам добрым служыць.

*В. Зуёнак.*



***люстэ́рка*** — рус. *зе́ркальце*
***гу́жам*** — *адзін за адным*

Выпішыце выдзеленыя словы. Назавіце ў іх мяккія зычныя гукі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць зычных гукаў на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**Рм** **10.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Майго (маю) … па парцe клічуць … .
У … з намі кватэры жыве сям'я … .
На дрэве ў двары сядзіць … кот.
Краіны **Літва**, Латвія, Расія, **Польшча**, Украіна — … Беларусі.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *суседку, суседа, суседкі, суседняй, суседскі*.

Запішыце апошні сказ. У выдзеленых словах назавіце мяккія зычныя гукі. У якім з гэтых слоў літар больш, чым гукаў? Чаму?

**11.** Прачытайце прымаўку. Калі так гавораць?

Рыбка ў рацэ́, ды не ў руцэ́.

Назавіце словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Назавіце зычныя гукі ў гэтых словах. Яны мяккія ці цвёрдыя?

**12.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.



Правообладатель Национальный институт образования

Пайшоў Сёма лавіць сома,
Соня спіць спакойна дома.
Сёму — сом, Соні — сон.

*М. Мінчанка.*

Назавіце пары слоў, якія адрозніваюцца адным гукам. Запішыце гэтыя словы пад дыктоўку настаўніка.

Назавіце пару слоў, якая адрозніваецца гукамі [с] — [с’].



**13.** Прачытайце верш.



З татам крочым на рыбалку,
я люблю рыбалку змалку.
Вуды, бле́шня і чарвяк...
Ты плыві да нас, шчупак!

*Т. Мушынская.*



***бле́шня*** *— металічная пласцінка, да якой прымацоўваецца кручок*

Спішыце першы сказ. Падкрэсліце словы, у якіх усе зычныя гукі цвёрдыя.



Правообладатель Национальный институт образования

## Зычныя гукі [д] — [дз’]

**14.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе. Назавіце першы гук у словах. Які з гэтых гукаў мяккі?

**Дзіма дзіўна дзяліў дыню.**

**15.** Вымавіце словы парамі.

**гарады́ — у горадзе**
**бяда — у бядзе**
**вада — на вадзе**
**дні — дзень**

Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Які з гукаў цвёрды, а які — мяккі?

Запішыце пары слоў.

Гук [д] цвёрды. На пісьме ён абазначаецца літарай ***д***. Пасля літары ***д*** пішуцца **а, о, у, э, ы**: *дом*, *дым*.

Гук [дз’] мяккі. На пісьме ён абазначаецца спалучэннем літар ***дз***. Пасля ***дз*** пішуцца ***е, ё, ю, я, і, ь***: *дзень*, *дзяўчынка*.



Правообладатель Национальный институт образования

**16.** Разгледзьце схему на форзацы. З апорай на яе раскажыце правіла перадачы на пісьме гукаў [д] і [дз’].

Прыдумайце і намалюйце сваю схему або малюнак, якія дапамагаюць запомніць правіла.

## Гаварыце правільна

Стадыён — стадыёнам, біятло́н — біят-ло́нам, чэмпіён — чэмпіёнам.

*стадыён*

**Рм** **17.** Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з рубрыкі «Гаварыце правільна».

Кожны дзень Федзя спяшаецца на … . Ужо другі год хлопчык займаецца … . Ён старанна трэніруецца. Федзя марыць стаць алімпійскім … .

Запішыце сказы. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай. Назавіце цвёрдыя звычныя гукі ў слоўнікавым слове.



Які від спорту называюць біятлонам? Якіх вядомых беларускіх біятланістаў вы ведаеце?



Правообладатель Национальный институт образования



**18.** Спішыце. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

Дрэва пасадзіў — дабро людзям зрабіў.

**19.** Прачытайце прыказку. Якія гукі вымаўляюцца на месцы пропускаў? Якія літары трэба ўставіць у словы?

Сапраў..ны сябар не пакіне таварыша ў бя..е.

Спішыце. Устаўце патрэбныя літары.

**20.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Назавіце словы з гукам [дз’].



— санітар лесу.



любіць жалуды.



— прыгожыя птушкі.

Запішыце сказы. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.



Правообладатель Национальный институт образования

**21.** Паслухайце верш. Чаму дзяцей назвалі добрымі?

Ехалі дзеці аднойчы ў трамваі.
Месцы дарослым яны ўступалі,
дапамагалі сыходзіць старым.
— Добрыя дзеці, — казалі ўсе ім.
*Т. Кляшторная.*

Назавіце словы, у якіх ёсць гук [дз’].

**Рм** Вусна адкажыце на пытанні.

1. Як трэба паводзіць сябе ў аўтобусе, трамваі, тралейбусе?
2. Каму трэба ўступаць месца ў транспарце?

**22.** Паслухайце верш. Як дапамагае Жора дарослым? Як вы разумееце выраз *ты для нас — апора*?

### Апора

..ень без руху — нецікавы,
не люблю ся..ець без справы.
Я шпакам змайструю хатку,
маме я ўскапаю градку,



Правообладатель Национальный институт образования

для дзядулі без сяброў
накалю гару я дроў.
Тата хваліць: «Дзякуй, Жора!
Ты для нас усіх — апора».

*В. Рамашка.*



Спішыце першы сказ, устаўце патрэбныя літары. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***дз***.

Выпішыце з верша словы ветлівасці.

Рм Раскажыце, якія справы вы любіце рабіць разам з дарослымі.

**23.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.

Назавіце словы з гукамі [д], [дз']. Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.



Правообладатель Национальный институт образования



**24.** Спішыце, устаўце ***д*** або ***дз***. Падкрэсліце ***дз*** разам з наступнай літарай.

У Валодзі ёсць малодшая сястра На..я. Валодзя хо..іць у школу, а На..ейка — у ..іцячы са..ок.

**25.** Паслухайце верш. Які гук прапушчаны ў словах? Якімі літарамі трэба яго абазначыць?



Лыч задзёр у неба дзік:  
дзіва — хо..іць мала..ік.  
Дзік па небе не ха..іў —  
..ік на градах насля..іў.

*М. Чарняўскі.*

Спішыце другі сказ, устаўце патрэбныя літары.

**Будзьце ўважлівыя!**

| **па-беларуску** | **па-руску** |
|---|---|
| ты́дзень | неде́ля |
| нядзе́ля | воскресе́нье |

**26.** Дапоўніце сказ патрэбным словам. Назавіце словы з гукам [дз’]. Запішыце сказ пад дыктоўку настаўніка.

Сем дзён — гэта ... .



Правообладатель Национальный институт образования

Рм **27.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Для гэтага перакладзіце рускія словы на беларускую мову.

Цэлы *неделя* … Міколка ва ўсім дапамагаў маме і тату. Яны былі ўдзя́чныя сыну. Наступіла *воскресенье* … . Бацькі́ вырашылі схадзіць з сынам у кіно.

***удзя́чныя*** — рус. *благода́рные*

Назавіце словы з гукам [дз’].

**28.** Прачытайце назвы дзён тыдня. Размясціце іх па парадку.

Аўторак, сера..а, паня..елак, чацвер, субота, пятніца, ня..еля.

Спішыце. Устаўце ***д*** або ***дз***, растлумачце іх правапіс.

*чацве́р*

**29.** Прачытайце. Змяніце словы ў дужках так, як патрабуе сэнс.



Правообладатель Национальный институт образования

Цыбуля расце на *(агарод)*.
Грушы растуць у *(сад)*.
Вялікі завод ёсць у *(горад)*.
Саша катае брата на *(веласіпед)*.

Запішыце адзін сказ на выбар. Назавіце словы з гукам [дз’].



**30.** Прачытайце.

Дзве сяброўкі на гра..е
скачуць спрытна, як ні..е.
Хто прагоніць Зоську, Юльку?
Патапталі ўсю цыбульку.

*Л. Фарботка.*

Спішыце першы сказ. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс.

## Зычныя гукі [т] — [ц’]

**31.** Прачытайце загадкі, адгадайце іх. Знайдзіце словы з гукамі [т], [ц’]. Вымавіце словы.



1. Жалезны конь, у жываце агонь, есці не просіць, арэ, жне і косіць.



Правообладатель Национальный институт образования



2. Не матор, а гудзіць, не самалёт, а ляціць, не змяя, а джаліць.

Спішыце адну загадку, напішыце адгадку. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

**32.** Вымавіце словы парамі.

верталё**т** — на верталё**це**
бало**та** — на бало**це**
біле**т** — на біле**це**
рабо**та** — на рабо**це**

Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Які з гукаў цвёрды, а які — мяккі?

Гук [т] цвёрды. На пісьме ён абазначаецца літарай ***т***. Пасля літары ***т*** пішуцца ***а, о, у, э, ы***: *ха**та**, ка**ты́***.
Гук [ц'] мяккі. На пісьме ён абазначаецца літарай ***ц***. Пасля літары ***ц***, якая абазначае мяккі зычны гук, пішуцца ***е, ё, ю, я, і, ь***: *у ха**це**, ко**ці**к*.

**33.** Разгледзьце схему на форзацы. З апорай на яе раскажыце правіла перадачы на пісьме гукаў [т] і [ц'].



Правообладатель Национальный институт образования

**34.** Прачытайце сказы.

Тата ўзяў білеты на **самалёт. На самалёце** мы паляцім у госці да цёткі.

У Салігорску ёсць незвычайная салянáя **шахта. У** гэтай **шахце** лечаць людзей ад розных хвароб.

Выпішыце выдзеленыя словы парамі. Цвёрдыя ці мяккія гукі абазначаюць літары ***т, ц*** у гэтых словах?

Знайдзіце ў сказах іншыя словы з гукам [ц'].



**35.** Спішыце. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

Коцік-каток нітак клубок закаціў у куток.

**36.** Паслухайце скорагаворку. Назавіце словы з гукам [ц']. Прачытайце.

— Цецярук, цецярук, дзе твая цяцера?
— Мая цяцера цецеранятам **цеста** месіць.

*В. Вітка.*

Змяніце выдзеленае слова так, каб замест гука [т] вымаўляўся [ц']. Запішыце гэтыя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

**37.** Прачытайце тэкст. Якія прыкметы вясны аўтар апісвае ў творы?

Засмяялася ў небе сонейка. Забу́лькалі пад снегам ручаі. На таполі замахаў крыламі чорны грак.

Снег у полі па..ямнеў і асе́ў. На ўзгорках чарнею..ь прата́лінкі. На дрэвах набухаю..ь пупышкі. Весела звіня..ь сінічкі. Звонка грукае дзя..ел на старой асіне.

*В. Кастручын.*

***прата́лінка*** *— месца, дзе растаў снег і адкрылася зямля*
***асе́ў*** *— апусціўся слоем*

Вымавіце словы з прапушчанымі літарамі. Які гук чуецца на месцы пропускаў? Якой літарай яго трэба абазначыць?

Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.

## Гаварыце правільна

*тэлефо́н, тэлеві́зар, камп’ю́тар*



Правообладатель Национальный институт образования

Рм **38.** Прачытайце. Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Увечары ўсе адпачываюць. Дзядуля з бабуляй глядзяць ... . Мама размаўляе па ... . А Цімоша з татам сядзяць за ... .





С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *камп'ютарам, тэлевізар, тэлефоне.*

Раскажыце, як вы адпачываеце.



**39.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.

Праз палі, масты, лясы
ля..яць словы-галасы.
Дзякуючы правадам
кажу..ь тут, а чую..ь там.

*У. Мацвеенка.*

ле
тэ
фон

Спішыце. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце ў словах ***ц*** разам з наступнай літарай.



Правообладатель Национальный институт образования

## Гаварыце правільна

| | |
|---|---|
| старэйшы брат | старэйшы за сястру |
| малодшы брат | малодшы за сястру |

Рм **40.** Вусна раскажыце пра свайго брата або сястру. Карыстайцеся словамі ў дужках.

У мяне ёсць (*старэйшы, малодшы*) брат. Я (*старэйшы, старэйшая, малодшы, малодшая*) за брата на ... (*год, гады́, гадоў*).

У мяне ёсць (*старэйшая, малодшая*) сястра. Я (*старэйшы, старэйшая, малодшы, малодшая*) за сястру на ... (*год, гады́, гадоў*).

*ёсць*

Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў сказах?

**41.** Прыдумайце новыя словы па ўзоры. Запішыце.

Узор: *брат — брацік.*

самалёт — ...
верталёт — ...
білет — ...
салдат — ...



Правообладатель Национальный институт образования

Рм Дапоўніце сказы словамі, якія падыходзяць па сэнсе.

**У Тані ёсць маленькі … . Дзяўчынка зрабіла яму папяровы … .**

Запішыце сказы.

**42.** Прачытайце. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Змайстраваў старэйшы **брат**
мне драўляны **самакат.**
Усміхнуўся, кажа ён:
— Ну, давай, бяры разгон!
Хоць імча..ь і страшнавата,
не магу падво..іць брата.

*М. Мятліцкі.*

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце літары ***д*** або ***дз***, ***т*** або ***ц***.

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб замест [т] вымаўляўся [ц’].

Рм Раскажыце, як вы клапоціцеся пра свайго брата або сястру.



Правообладатель Национальный институт образования

**43.** Прачытайце тэкст. Што зразумеў Сенька? З чаго пачынаецца ваша раніца?

## Зразумеў

Сенька расплюшчыў вочы і ўбачыў ма..і, якая пякла аладкі. Ён **хуценька** саскочыў з ложка і падбег да печы.

— Мама, дай аладку! — папрасіў хлопчык. — Я хачу ес..і.

— Можа б, ты, сынок, спачатку памыўся, — параіла ма..і.

— Дык я ж учора ўмываўся...

— Але ж ты ўчора і еў... — ласкава сказала ма..і.

Сенька пастаяў з хвілінку, падумаў і подбегам кінуўся да ўмывальніка. *(П. Рунец.)*



***по́дбегам*** *— вельмі хутка, падбягаючы*

Якую літару трэба ўставіць у словы? Які гук яна абазначае ў гэтых словах? Змяніце выдзеленае слова так, каб замест [ц’] вымаўляўся [т].

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у першым сказе. Запішыце гэты сказ. Падкрэсліце ўстаўленую літару.



Правообладатель Национальный институт образования



**44.** Прачытайце прыказкі. Якія літары трэба ўставіць у словы. Растлумачце іх правапіс.

Не так лёгка зрабі..ь, як сказа..ь.
Языком мало..ь — не дровы кало..ь.

Спішыце, падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**45.** Прачытайце верш.

Зранку чу́цен мала..ок.
Так шчыру́е мала хто.
Прыпявае:
— Шпок-шпак,
Бу..еш ме..ь ква..эру, шпак.

*П. Марціновіч.*



***шчыру́е*** — рус. *усердствует*

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Устаўце літары ***д*** або ***дз,*** ***т*** або ***ц***. Растлумачце іх правапіс.

**Рм** З якой мэтай робяць шпакоўні? Якім яшчэ птушкам людзі дапамагаюць рабіць жыллё?



Правообладатель Национальный институт образования

**46.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Якія літары трэба ўставіць у словы на месцы пропускаў? Чаму?

Для шпака дзе..і робя..ь … .
Для сінічак лю..і майструю..ь … .
Гняздо бусла — гэта … .



С л о в ы д л я д а в е д к і: *буслянка, шпакоўню, сінічнік.*

Запішыце першы сказ пад дыктоўку настаўніка.

**47.** Прачытайце. Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***ц***.

Таня, тень, том, тётя, кустик, Витя.

Назавіце словы, якія аднолькава вымаўляюцца і пішуцца па-руску і па-беларуску.



Правообладатель Национальный институт образования

**48.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка. Змяніце словы так, як патрабуе сэнс. Які гук вымаўляецца ў іх замест [т]?

| | |
|---|---|
| У панядзелак мама была на ... . | *хата* |
| Бабуля прыбірае ў ... . | *работа* |
| Жабы квакаюць на ... . | *балота* |

Запішыце сказы. Падкрэсліце ***ц*** разам з наступнай літарай.


Гульня «Чароўныя фарбы» ([т] — [ц’]).



**49.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Растлумачце іх правапіс.

1. Пryля..еў  .

2. На  прывезлі пош..у.

3. Тата любі..ь чыта..ь  .

4. У  можна прачыта..ь пра навіны ў краіне.

Запішыце сказы, устаўляючы ў словы на месцы пропускаў ***т*** або ***ц***.



Правообладатель Национальный институт образования

## Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі

**50.** Прачытайце словы. Выразна вымавіце першы гук у кожным слове. Ён цвёрды ці мяккі?

**Ж**ыта, **дж**ала, **р**аніца, **ч**апля, **ш**эрсць, **ц**ырк, **ж**ук.

Якія літары пішуцца пасля выдзеленых літар?

Зацвярдзелыя зычныя гукі [р], [ж], [ш], [ч], [дж], [ц] не маюць парных мяккіх. Пасля літар, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі, пішуцца ***а, о, у, ы, э***: ***ша****фа*, ***жо****луд*, *р****у****ка*, ***цы****буля*, ***рэ****ха*, ***джэ****м*.

**51.** Разгледзьце стужку гукаў. Якія гукі толькі цвёрдыя і ў рускай, і ў беларускай мовах?

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| [р] | [ж] | [ш] | [ч] | [дж] | [ц] |

**52.** Прачытайце.

Чысты, час, гарачы, чуб, човен, чэк.

Якія словы аднолькава пішуцца, але па-рознаму вымаўляюцца ў рускай і беларускай мовах?



Правообладатель Национальный институт образования

**53.** Дапоўніце сказ слоўнікавым словам і запішыце.

Гарадская падземная электрычная чыгунка — гэта ... .

*метро́*

Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

**54.** Дапоўніце словы ў слупках патрэбным складам або літарай. Што абазначаюць гэтыя словы?

| **ба** | **ка** | **г** |
|---|---|---|
| ..ян | дуд.. | ..ітара |
| ..рабан | скрып.. | ..услі |
| ..лалайка | жалей.. | ..армонік |

Знайдзіце і выпішыце словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі. Назавіце гэтыя гукі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

Словы другога слупка вусна расстаўце ў алфавітным парадку.



Правообладатель Национальный институт образования

**55.** Прачытайце верш. Ці правільна зайчык вывучыў ноты? Што выклікала ў вас усмешку?



## Зайчыкавы ноты

У музычнай школе
**зайч..к** дзень **прабыў.**
— До-рэ-мі-фасоля! —
ноты ён **вуч..ў.**
Потым ля загона
рваў стручкі за трох.
І спяваў натхнёна:
— До-рэ-мі-**гарох**!

*В. Гардзей.*

Выпішыце выдзеленыя словы. Устаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.



**56.** Спішыце скорагаворку. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Б’е баран у барабан, барабаншчык наш баран. *(А. Вольскі.)*



Правообладатель Национальный институт образования

**57.** Прачытайце скорагаворкі. Навучыцеся правільна вымаўляць іх.

Цэлы месяц міла-лю́ба
грэлася пад сонцам бульба.

Шэпча, шэпча небыліцы
ў чэрвені жыта пшаніцы.

За шырокім шэрым тынам
узрушана шуміць ляшчына.

*С. Шах.*

***тын*** — рус. *забо́р*
***узру́шана*** — *усхвалява́на*

Выпішыце словы з зацвярдзелымі зычнымі гукамі [ж], [ш], [ц]. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

## Будзьце ўважлівыя!

У беларускай мове пішам:

| | | |
|---|---|---|
| **жы**во́т | **шы́**шка | **цэ**ме́нт |
| **жэ**ле́ | **шэ**сць | **цэ**х |



Правообладатель Национальный институт образования

**58.** Дапоўніце словы ў слупках патрэбнымі спалучэннямі літар.



| **жы шы** | **жэ шэ цэ** |
| --- | --- |
| ..та | ..рань |
| ..пшына | ..ле |
| каню..на | ..гла |





***цэ́гла*** — рус. *кирпи́ч*
***шэ́рань*** — рус. *и́ней*

**59.** Паслухайце тэкст. З чаго раней выраблялі ручнікі? Як іх упрыгожвалі?

Ручнікамі карыстаюцца на Беларусі з даўніх часоў. Асноўнымі іх колерамі заўсёды былі белы і ч..рвоны. Раней ручнікі ткалі з лёну на кроснах, упрыгожвалі выш..ўкай, кару́нкамі. Імі карысталіся кожны дзень. Без прыгож..х ручнікоў не абыходзілася ніводная важная падзея ў жыцці ч..лавека.





Правообладатель Национальный институт образования

***кару́нкі*** — рус. *кру́жево*
***кро́сны*** — *ткацкі станок*

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс. Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі.

Рм Дапоўніце сказы патрэбным словам. Запішыце.

На кухні матуля павесіла прыгожы ... .
Гэты ... вышывала мая бабуля.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**60.** Прачытайце тэкст. Як вы віншуеце сваіх матуль з днём нараджэння?

Наташ..на бабуля выш..вае прыгож..я абру́сы, ручнікі. Яна навучыла і ўнучку. Дзяўчынка выш..вае сурвэтку. Наташа рыхтуе падарунак матулі да дня нараджэння.

Растлумачце правапіс прапушчаных літар. Спішыце сказы, у якіх ёсць словы з прапушчанымі літарамі. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.



Правообладатель Национальный институт образования



**61.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

**Чуж..м розумам не праж..веш.**
**Шануй старэйш..х, барані́ малодш..х.**

Растлумачце правапіс прапушчаных літар. Спішыце. Падкрэсліце літары, якія ўставілі.

**62.** Прачытайце словы першага слупка. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

| | |
|---|---|
| **ц**уд | білe**т** — біле**ц**ік |
| **ц**ырк | кус**т** — ... |
| **ц**а**ц**ка | бан**т** — ... |
| **ц**ыбуля | ко**т** — ... |

Прачытайце словы другога слупка. Які гук абазначаюць выдзеленыя літары?

Змяніце словы другога слупка па ўзоры. На які гук змяняецца [т] пры змякчэнні?

**Завяжы вузялок!**

**У беларускай мове ёсць цвёрды гук [ц] і мяккі гук [ц’]. Яны не ўтвараюць пары па цвёрдасці-мяккасці.**



Правообладатель Национальный институт образования

**63.** Прачытайце. Выпішыце словы, у якіх літара ***ц*** абазначае зацвярдзелы зычны гук. Падкрэсліце літары, якія пішуцца пасля ***ц***.

Сцяна, цукар, вецер, раніца, касцёр, цэгла, сцюжа, цымбалы, ціішыня.

Сярод слоў знайдзіце назву музычнага інструмента. Як называюць чалавека, які іграе на цымбалах?

**64.** Прачытайце верш.

## Жа́біны канцэрты

На балоце, пры рацэ,
дзіўны хор дае канцэрт.
— Ква-ква-ква! —
пяе балота.
Не канцэрт — адна смяхота!
— Ква-ква-ква! —
гайдае долы.
Слухайце КВАнцэрт вясёлы.

*К. Камейша.*

Выпішыце ў адзін слупок словы з зацвярдзелым гукам [ц], а ў другі — словы з мяккім гукам [ц’].



Правообладатель Национальный институт образования

**65.** Прачытайце. Адгадайце загадку.



Вось загадка для Андрэйкі:
там і шпалы ёсць, і рэйкі,
малаточкі па іх б'юць
і мелодыю вядуць.

*У. Мацвеенка.*

Спішыце загадку, напішыце адгадку. Назавіце словы з мяккім гукам [ц']. Падкрэсліце слова з зацвярдзелым гукам [ц].

**66.** Прачытайце прыказку. Якому чалавеку можна лёгка ўсё растлумачыць?

Разумнай галоўцы досыць два слоўцы.



***до́сыць* — *дастаткова***

Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка. Падкрэсліце літару, якая абазначае зацвярдзелы гук [ц].



**67.** Прачытайце. Спішыце.

Маме падарунак —
моцны пацалунак,



Правообладатель Национальный институт образования

сястры — усмешка,
брату — пацешка.
*Н. Галіноўская.*

Падкрэсліце літару ***ц***, якая абазначае мяккі гук [ц’], адной рыскай. Літару ***ц***, якая абазначае зацвярдзелы гук [ц], падкрэсліце дзвюма рыскамі.

## Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

### Успомніце з урокаў рускай мовы

Якія зычныя гукі з’яўляюцца звонкімі, а якія — глухімі? Прывядзіце прыклады зычных гукаў, якія вымаўляюцца з голасам і шумам; толькі з шумам.

**68.** Паслухайце словы.

**б**орт — **п**орт
**з**ала — **с**ала
**дз**ерці — **ц**ерці
**ж**ар — **ш**ар
**д**ачка — **т**ачка
**Дж**эк — **ч**эк

Прачытайце пары слоў. Якія зычныя гукі ў пачатку слова вымаўляюцца звонка, а якія — глуха?



Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

Большасць звонкіх і глухіх зычных гукаў утвараюць пары.

**69.** Разгледзьце стужку гукаў. Назавіце звонкія і глухія зычныя гукі, якія ўтвараюць пары.

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [б] | [б’] | [г] | [г’] | [д] | [дз’] | [з] | [з’] | [ж] | [дж] |
| [п] | [п’] | [х] | [х’] | [т] | [ц’] | [с] | [с’] | [ш] | [ч] |

**70.** Замяніце ў пачатку слоў звонкія гукі на парныя глухія. Запішыце словы.

Біць, дзень, баліць, борт, дом, брама, заліць, Дзіма.



***бра́ма*** — рус. *ворота*

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць парныя глухія гукі ў пачатку слоў.

**71.** Прачытайце сказы. Выпішыце пары слоў, якія адрозніваюцца парнымі глухімі — звонкімі зычнымі.



Правообладатель Национальный институт образования

Дзядзька Глеб малоціць хлеб. *(Н. Сторажава.)*

У гарачы дзень мы хаваемся ў цень. *(Н. Сторажава.)*

Ля вадзіцы блізка лёгка скача пліска. *(С. Шушкевіч.)*

Наша Маша мёд на булку мажа.

Падкрэсліце літары, якімі адрозніваюцца гэтыя словы.

**72.** Паслухайце верш. Якое свята мы адзначаем у пачатку вясны? Чаму вясна ў Надзі атрымалася падобнай на матулю?

Надзя ў альбоме вясну малявала —
гожая дужа вясна паўставала.
Вобраз вясны атрымаўся жаночы:
мілая ўсмешка, чароўныя вочы,





Правообладатель Национальный институт образования

кропкі вяснушак ля ясных вачэй,
шчокі палаюць за сонца ярчэй,
ну а на шчоках — вясёлыя ямачкі, —
Надзя пісала малюнак свой з мамачкі.

*В. Жуковіч.*

Спішыце першы сказ. Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары? Назавіце парныя ім звонкія або глухія зычныя гукі.

**Рм** Прачытайце словы з верша, якія дапамагаюць апісаць Надзіну маму. Апішыце сваю матулю.

*мя́ккі*

**73.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Матуліны рукі заўсёды мяккія.

Спішыце. Назавіце парныя звонкія або глухія зычныя гукі ў словах.



Падбярыце і запомніце яшчэ адну прыказку пра маму. Раскажыце яе аднакласнікам.



**74.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе. Пра якую сайку гаворыцца ў скорагаворцы?



Правообладатель Национальный институт образования

Знайшоў зайчык
сайкі акрайчык.
Цешыўся зайка:
сайка-кусайка!
*М. Чарняўскі.*

Спішыце. Падкрэсліце пару слоў, якая адрозніваецца парнымі звонкім і глухім гукамі.

**75.** Прачытайце словы. Правільна вымавіце гукі на месцы выдзеленых літар.

| | |
|---|---|
| [б] [п]<br>гры**б**ы — гры**б** | [п] [б]<br>ры**б**ка — ры**б**а |
| [д] [т]<br>пла**д**ы — пло**д** | [т] [д]<br>гра**д**ка — гра**д**а |
| [ж] [ш]<br>на**ж**ы — но**ж** | [ш] [ж]<br>лы**ж**ка — лы**ж**ачка |
| [з] [с]<br>гарбу**з**ы — гарбу**з** | [с] [з]<br>ка**з**ка — ка**з**ачка |

Як вымаўляюцца звонкія зычныя гукі перад галоснымі? Як вымаўляюцца гэтыя зычныя ў канцы слоў і ў сярэдзіне слова перад зычным?



Правообладатель Национальный институт образования

Правапіс слоў з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі ў канцы і ў сярэдзіне слова перад іншымі зычнымі трэба правяраць. Для гэтага трэба змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук: *сцежка — сцежачка, кашка — каша.*

**76.** Прачытайце словы. Якія літары трэба пісаць на месцы пропускаў? Чаму? Спішыце пары слоў, устаўце прапушчаныя літары.

халады́ — хола..
чыжы́ — чы..
маразы́ — маро..
арэхі — арэ..
браты́ — бра..
кашы́ — ко..

**Завяжы вузялок!**

[ш]
лы?ка → лыжачка → лыжка
[с]
но? → насы → нос

праверачныя словы

**77.** Прачытайце верш. Як хлопчык дапамагаў маме пячы пірог?

З мамай мы **піро*(г/х)*** пяклі
так старанна, як маглі.



Правообладатель Национальный институт образования

Маме я дапамагаў:
ёй рэцэпт услых чытаў.
**Лё*(г/х)*** на стол піро*(г/х)* духмяны,
зверху — зорачкі-бананы.
Маме зноў я **дапамо*(г/х)*** —
першым каштаваў піро*(г/х)*.

*Т. Сучкова.*



Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук. Выпішыце гэтыя словы, устаўце патрэбныя літары.

**Будзьце ўважлівыя!**

| у рускай мове | | у беларускай мове | |
|---|---|---|---|
| [г] | [к] | [г] | [х] |
| пирогá — пирóг | | пірагá — пірóг | |

**78.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Дарагі не **абе*(т/д)***, а **прыве*(т/д)***.

Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук. Якія літары трэба ўставіць у словы?

Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.



Правообладатель Национальный институт образования

**79.** Якія словы з парнымі звонкімі і глухімі зычнымі ў канцы трэба дапісаць?

дрэва

12 месяцаў

жывёла

| | | |
|---|---|---|
| д | .. | .. |
| г | .. | .. |
| к | .. | .. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| г | .. | .. | .. | .. | птушка |
| г | а | .. | .. | .. | памяшканне для машын |
| г | а | р | .. | .. | расліна |

Запішыце словы. Вусна падбярыце да іх праверачныя.

**80.** Прачытайце спалучэнні слоў. Якія літары трэба ўставіць у словы замест пропускаў? Вусна падбярыце праверачныя словы.



белы гры..*(б/п)*

захварэў на гры..*(б/п)*





смачны пло..*(д/т)*

драўляны пло..*(д/т)*





Правообладатель Национальный институт образования



ле..(*з/с*) на дрэва
густы ле..(*з/с*)





шэры ко..(*д/т*)
складаны ко..(*д/т*)





**81.** Прачытайце. Вусна падбярыце праверачныя словы.

Блішчаць расою ле(*з/с*) і долы,
у чырвані гарыць усхо(*д/т*).
Прачнуліся пад спеў вясёлы
і лу(*г/х*), і са(*д/т*), і агаро(*д/т*).

*А. Вольскі.*

Спішыце. Устаўце патрэбныя літары.

**82.** Прачытайце словы. Якія літары трэба ўставіць на месцы пропуску? Чаму?

грыбы — гры..кі
лёгенькі — лё..кі
дзядзечка — дзя..ька

бяроза — бяро..ка
радок — ра..кі
піражок — піра..кі

Спішыце пары слоў, устаўце прапушчаныя літары і падкрэсліце іх.



Правообладатель Национальный институт образования

**83.** Прачытайце верш. Вусна змяніце выдзеленыя словы так, каб пасля зычнага стаяў галосны гук.

Я стаю на **бера(*ж/ш*)ку,**
а рачулка льецца.
**Ры(*б/п*)ка** плавае ў вадзе,
сонейка смяецца.

*У. Карызна.*

Спішыце. Устаўце ў словы патрэбныя літары.

**84.** Дапоўніце словы прапанаванымі літарамі.

| | | |
|---|---|---|
| | ш | |
| мі | .. | ка |
| | с | |

| | | |
|---|---|---|
| | з | |
| ка | .. | ка |
| | с | |

| | | |
|---|---|---|
| | д | |
| ра | .. | кі |
| | ж | |

| | | |
|---|---|---|
| | ш | |
| ко | .. | ка |
| | с | |

| | | |
|---|---|---|
| | ж | |
| но | .. | ка |
| | ч | |

Якія гукі абазначаюць устаўленыя літары? Вусна падбярыце праверачныя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

**85.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

У студню вады не льюць, а ў **лес** дроў не вязуць.

Да чыстай крыніцы **сцежка** ўтоптана.

***сту́дня* — *калодзеж***

Назавіце ў выдзеленых словах літары, напісанне якіх трэба правяраць. Спішыце.

**86.** Адгадайце загадку.



Па лу*(ж/ш)*ку ідзе цыбаты,
уцякаюць жабяняты.
Уцякаюць жа*(б/п)*кі,
аж мільгаюць ла*(б/п)*кі.

*А. Дзеружынскі.*

Спішыце. Устаўце патрэбныя літары, вусна падбярыце праверачныя словы.

**Завяжы вузялок!**

Звонкія зычныя [й’], [ў], [р], [м], [м’], [н], [н’], [в], [в’], [л], [л’] не маюць парных глухіх. Глухія зычныя [к], [к’], [ф], [ф’] не маюць парных звонкіх.



Правообладатель Национальный институт образования

## Будзьце ўважлівыя!

**У беларускай мове**

**звонкія** **[в], [в’]** — **глухія** **[ф], [ф’]**

**не ўтвараюць пары.**

**87.** Прачытайце верш. Якія змены адбываюцца ў прыродзе з надыходам вясны? Якія фарбы выкарыстоўвае Красуня-Вясна?



Спытала Ганулька
ў кветак і траў:
— Скажыце, хто **лу*(г/х)***
так прыгожа прыбраў?
Гаворыць дзяўчынцы вятроў гамана:
— Лугамі хадзіла Красуня-Вясна!

Спытала Ганулька ў шумных палёў:
— Хто фарбы такое пяшчоты знайшоў?
І чуе ў **адка*(з/с)*** зноў такое яна:
— Палямі хадзіла Красуня-Вясна!

*М. Мятліцкі.*



***гамана́*** — *шум*



Правообладатель Национальный институт образования

У другім слупку знайдзіце словы з няпарнымі глухімі зычнымі гукамі.

Вусна падбярыце да выдзеленых слоў праверачныя словы. Выпішыце выдзеленыя словы, устаўце патрэбныя літары.

**88.** Прачытайце тэкст.



Яшчэ ляжыць снег у лесе, але ўжо дзе-нідзе зелянее траўка. На ўскрайку лесу глянула сіненькім вочкам пралеска. Яна самая першая кветка вясны.

Назавіце словы з няпарнымі глухімі зычнымі гукамі. Назавіце літары ў словах, напісанне якіх трэба правяраць.

*меда́ль*

**89.** Прачытайце словы. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Залаты, алімпійскі, бронзавы, сярэбраны, блізкі, прыгожы, вузкі, вясёлы.

Якім можа быць медаль? Дапоўніце сказ словам, якое падыходзіць па сэнсе.

Беларускі спартсмен атрымаў ... медаль.



Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце сказ. Падкрэсліце ў словах літары, якія абазначаюць няпарныя звонкія зычныя гукі.



Назавіце алімпійскія віды спорту, у якіх беларускія спартсмены заваёўвалі медалі́. Пры неабходнасці знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.

**90.** Замяніце выдзеленыя словы словамі з процілеглым значэннем.

*горкі перац — салодкі перац*
**густы** лес — ...
**шырокая** рака — ...

Запішыце новыя спалучэнні слоў. Падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба праверыць. Вусна падбярыце праверачныя словы.



**91.** Спішыце, устаўце патрэбныя літары.

Гром на голы ле*(з/с)* — вясна халодная. Якія ручаі, вялікія ці малыя, — такая і паво*(д/т)*ка.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць няпарныя звонкія зычныя гукі.



Правообладатель Национальный институт образования

## Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме

**92.** Параўнайце вымаўленне слоў. У якіх словах гукі вымаўляюцца падоўжана?

каме**нь** — каме**нне** | но**ч** — но**ччу**
кры**л**о — кры**лл**е | кола**с** — кало**сс**е

Як перадаецца на пісьме падоўжанае вымаўленне зычных гукаў?

> Гукі [ж], [ш], [ч], [з'], [с'], [л'], [н'], [ц'], [дз'] паміж галоснымі могуць вымаўляцца падоўжана. Падоўжанае вымаўленне гукаў на пісьме перадаецца дзвюма літарамі: *Палессе, збожжа, заціша*.

**93.** Паслухайце тэкст. Назавіце прыметы вясны. Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі.

### Надыход вясны

Ва ўсім адчуваўся надыход вясны. Сонечнае праменне сагравала зямлю. З далёкага падарожжа вярнуліся шпакі. Усё наваколле патанула ў птушыных спевах.



Правообладатель Национальный институт образования

**94.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Сава вылятае на паляванне … . | *ноччу* |
| Пчолы жывуць у … . | *зацішша* |
| Перад навальніцай бывае … . | *вуллі* |



***навальні́ца*** — рус. *гроза*

Назавіце падоўжаныя зычныя гукі ў словах. Спішыце, падкрэсліце літары, якімі яны абазначаюцца.

**95.** Прачытайце прыказкі. Што з’яўляецца сапраўдным багаццем чалавека?

Навука — найлепшае бага*(ц/цц)*е.
Не ганарыся зва*(н/нн)*ем, а ганарыся ведамі.

Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

Запішыце словы з падоўжанымі зычнымі.



**96.** Прачытайце. Адгадайце загадку. Назавіце слова з падоўжаным зычным гукам.



Правообладатель Национальный институт образования

Стракатуха прыляцела
і на даху дома села.
Не жы*(ц/цц)*ё — адна маро́ка,
як пачне трашчаць … .

*Н. Парукаў.*





***маро́ка*** — *нешта блы́танае, незразуме́лае*

Спішыце загадку разам з адгадкай. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць падоўжаны гук [ц’].

**97.** Вымавіце словы.

стагоддзе паўгоддзе суддзя

Які гук вымаўляецца падоўжана? Як падаўжэнне гука [дз’] передаецца на пісьме?

Спішыце словы. Падкрэсліце літары, якімі на пісьме абазначаецца падоўжаны гук [дз’].

Рм У якім стагоддзі мы жывём?

Падоўжаны гук [дз’] на пісьме абазначаецца спалучэннем літар ***ддз***: ***разводдзе, ладдзя.***



Правообладатель Национальный институт образования

**98.** Прачытайце тэкст. Устаўце патрэбныя словы. Назавіце падоўжаныя зычныя гукі ў словах.



**Трашчыць … .** З … прадзіраецца з гушчару нешта вялікае, дужае. **Выходзіць зубр і спыняецца ў … .** Вялікая галава, шырокія грудзі здзіўляюць сваёй … і магутнасцю. *(Паводле В. Вольскага.)*

Словы для даведкі: *задуменні, галлё, фырканнем, веліччу.*

Спішыце выдзеленыя сказы, устаўляючы патрэбныя словы. Падкрэсліце літары, якімі абазначаюцца падоўжаныя зычныя гукі на пісьме.

**99.** Назавіце адным словам. Запішыце гэтыя словы.

**Ш Ш**

Плады, насенне некаторых раслін. *ла..я*

**Ж Ж**

Паездка па розных краінах. *стаго..е*



Правообладатель Национальный институт образования

Домікі для пчол. *заці..а*

Сто гадоў. *ву..і* **ДДЗ**

Часовае спыненне шуму. *падаро..а*

Шахматная фігура. *збо..а* **ЛЛ**



**100.** Прачытайце. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

Ох, і цёмна ж но*(ч/чч)*у ў пушчы:
ельнік стаў яшчэ гусцей.
Лось га*(л/лл)*ё сухое трушчыць
і чапляецца часцей.

*С. Грахоўскі.*



Спішыце апошні сказ.

## Будзьце ўважлівыя!

| у рускай мове | у беларускай мове |
|---|---|
| белорусский | беларускі |
| класс | клас |
| коллектив | калектыў |



Правообладатель Национальный институт образования

**101.** Прачытайце тэкст. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

На ўроках белару..кай мовы мы вучым новыя словы. На матэматыцы займаемся лічэ..ем. На ўроках фізкультуры вучні нашага кла..а ўдзельнічаюць у эстафетах. Су..ёй бывае настаўнік фізкультуры.

А самы вясёлы час у школе — гэта перапынак.

Спішыце трэці і чацвёрты сказы. Устаўце патрэбныя літары ў словы. Назавіце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі.

Рм Раскажыце, чым вы займаецеся на іншых уроках у школе.

*калектыў*

**102.** Прачытайце. Дапоўніце прыказку слоўнікавым словам. Чаму так гавораць?

Што аднаму не пад сілу, тое **лёгка** … .

Правапіс якой літары трэба правяраць у выдзеленым слове? Падбярыце праверачнае слова.

Спішыце, падзяляючы словы для пераносу. Якія словы нельга пераносіць з радка на радок?



Правообладатель Национальный институт образования

**103.** Разгадайце рэбусы.







Запішыце словы. Як бы вы перанеслі іх з радка на радок?

Словы з падоўжанымі зычнымі гукамі можна пераносіць на наступны радок так: *гал-лё*, *га-ллё*.

**104.** Паслухайце верш. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у словы.

На лужку зарэчным гра*(н/нн)*е
ды вясёлае гуля*(н/нн)*е:
сёння нараджэ*(н/нн)*я дзень
адзначае **авадзе́нь.**

*С. Бестава.*

Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі, падзяліце іх для пераносу.

Запішыце выдзеленае слова, падзяляючы яго на склады.



Правообладатель Национальный институт образования

**105.** Прачытайце. Спішыце першы сказ, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Та*(ц/цц)*янка абгарнула падручнік па чыта*(н/нн)*і. Цяпер ён у прыгожай вокладцы.

Словы з падоўжанымі зычнымі падзяліце для пераносу.



**106.** Прачытайце. Выберыце літары, якія трэба ўставіць у слова.

Сакавік — месяц абуджэ*(н/нн)*я прыроды ад зімовага сну.

Спішыце. Слова з падоўжаным зычным гукам падзяліце для пераносу.

**107.** Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Бага*(ц/цц)*ей, бага*(ц/цц)*е; збо*(ж/жж)*а, зба*(ж/жж)*ына́; жы*(ц/цц)*ь, жы*(ц/цц)*ё; праме*(н/нн)*е, праме*(н/нн)*ь; су*(дз/ддз)*я, су*(дз/ддз)*іць; бера*(ж/жж)*ок, узбярэ*(ж/жж)*а.



Правообладатель Национальный институт образования

**108.** Прачытайце. Якія літары прапушчаны ў словах? Якія гукі яны абазначаюць?



Ціха і цёмна ў пушчы. Пахне грыбамі і цві..ю. Здалёк пачулася чвяка..е. Гэта дзікі. Яны пакрыты чорным шчаці..ем. Галава ў дзіка доўгая, як у сві..і.



***цвіль*** — рус. *плесень*

Як выглядаюць дзікі? Спішыце сказы, якія даюць адказ на гэта пытанне. Падкрэсліце літары, якія ўставілі. Растлумачце іх правапіс.

**109.** Утварыце словы па ўзоры.

*Камень — каме́нне*, полаз — ... , прамень — ... , колас — ... , корань — ... , крыло — ... .

З адной парай слоў на выбар вусна складзіце сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**110.** Прачытайце тэкст. Раскажыце, як пачалася навальніца.

## Навальніца

Стаяў ясны дзень. Слабы ветрык гайдаў лісточкі на го..і дрэў. Раптам навокал пацямнела. Толькі верхавіны дрэў яшчэ залаціла сонечнае праме..е. Па шкле забарабанілі кроплі дажджу. Яркая ўспышка на імгне..е асвяціла сад. Грымнуў гром. Потым усё сціхла. Навальніца памчалася далей.

Растлумачце правапіс прапушчаных літар у словах. Выпішыце словы з падоўжанымі зычнымі гукамі, падзяляючы іх для пераносу.

**111.** Прачытайце. Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце.

Коллектив, раздолье, ночью, белорусский, класс, судья.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць падоўжаныя зычныя гукі.



Гульня «Чароўныя фарбы» (падоўжаныя зычныя).





Правообладатель Национальный институт образования



**112.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

Вецер разагнаў *(ноч, ноччу)* хмары на небе.

Сонечнае *(праменне, промні)* асвяціла наваколле.

Дрэвы апранулі зялёнае *(убор, убранне)*.

Бацькі і дзеці выправіліся ў цікавае *(вандроўка, падарожжа)*.

Запішыце сказы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць падоўжаныя зычныя гукі.

## Раздзяляльныя знакі — апостраф (’) і мяккі знак (ь)

**113.** Параўнайце вымаўленне слоў.

| | |
|---|---|
| пяро — пер’е | сям’я |
| верабей — вераб’і | куп’ё |



***куп’ё*** — рус. *ко́чки*

У якіх словах паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й’]? Выпішыце гэтыя словы. Падкрэсліце літары, перад якімі пішацца апостраф.



Правообладатель Национальный институт образования

Апостраф пішацца пасля літар, якія абазначаюць цвёрдыя зычныя гукі, перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***, калі паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й’]:

[й’э] [й’а] [й’у] [й’і]

*надвор’е, аб’ява, п’ю, вераб’і.*

Апостраф не пішацца пасля літары ***ў***:

[й’і] [й’э]

*салаўі, здароўе.*

**114.** Прачытайце сказы. Правільна вымавіце словы з апострафам.

Стаіць цёплае **надвор’е**. Бабуля выйшла ў агарод і пачала рваць бур’ян. Унучкі Мар’я і Дар’я дапамагаюць ёй.

Выпішыце словы з апострафам. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф. Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў выдзеленым слове.

**115.** Прачытайце народную прыкмету. Запомніце яе. Запішыце сказ па памяці.



Правообладатель Национальный институт образования

Поўня светлая і чыстая — на добрае надвор’е.



***по́ўня** — поўны месяц*

Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

**116.** Прачытайце словы. У якія з іх замест кропак трэба ўставіць апостраф?

Інтэрв..ю, салаў..іны, аб..ява, бар..ер, здароў..е, аб..ём, пра..езд.

***інтэрв’ю́** — гутарка з вядомым чалавекам па пытаннях, якія цікавяць многіх людзей*

Выпішыце словы з апострафам. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

Хто дае інтэрв’ю? Людзі якой прафесіі часта бяруць інтэрв’ю? Пры неабходнасці запытайцеся пра гэта ў бацькоў або знайдзіце патрэбныя звесткі ў інтэрнэце.



Правообладатель Национальный институт образования

**117.** Па схеме складзіце словы. Запішыце толькі словы з апострафам.

| | | |
|---|---|---|
| аб | → | ехаў |
| пад | → | ехаў |
| пера | → | ехаў |

| | | |
|---|---|---|
| аб | → | еў |
| пад | → | еў |
| пера | → | еў |



**118.** Прачытайце. Якія літары або знак трэба ўставіць у словы замест пропускаў?



Паміж дрэў — дыван куп..я́,
тут — зубрыная сям..я.
Бацька-зубр на мох прылё..,
аб пянёк пачухаў ро.. .

*В. Коўтун.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

**Успомніце**

**Для чаго служыць мяккі знак (ь)? Назавіце словы, у якіх мяккі знак абазначае мяккасць папярэдніх зычных.**



Правообладатель Национальный институт образования

**119.** Прачытайце спалучэнні слоў.

**палю** кветкі — **пальлю** кветкі
**салю** бульбу — **сальлю** ваду

У якіх словах паміж зычным і галосным вымаўляецца гук [й']?

**Завяжы вузялок!**

Мяккі знак можа не толькі абазначаць мяккасць зычных гукаў на пісьме (*пісьмо*, *камень*). Ён можа паказваць, што паміж мяккім зычным і галосным гукамі вымаўляецца гук [й']. Тады яго называюць раздзяляльным мяккім знакам.

**120.** Адгадайце загадку. Запішыце словы-адгадкі. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны ***ь***.

Ірву я шкодную траву з **-лю**,
вадою кветкі напаю з **-льлю**.



*..лю*



*..льлю*



Правообладатель Национальный институт образования

Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля літар ***л, н, з, с, ц***, спалучэння літар ***дз*** перад ***е, ё, ю, я, і***: ***льецца, Арсеньеў, Афанасьеў, парцье́ры, Аркадзьеў***.

**121.** Прачытайце. Выпішыце словы з раздзяляльным ***ь***. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны ***ь***.

**Ульяна Афанасьева, пісьмо, паштальён, льецца, вуге́льчыкі, мільён.**

**Рм** Раскажыце аб прафесіі паштальёна. Выкарыстайце словы:



*паштоўка*



*ліст*



*часопіс*




*газета*

Як па-іншаму можна назваць *ліст*?

**122.** Прачытайце. Адгадайце загадкі. Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў: раздзяляльны ***ь*** ці апостраф?



Правообладатель Национальный институт образования

Не есць, не п..е, а ходзіць і б..е. *(З народнага.)*




Гуляе, жыру́е. Міл..ён дзетак, у кожнага панцыр з манетак. *(У. Карызна.)*




**123.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Пры спісванні ўстаўце раздзяляльны ***ь*** або апостраф.

У Мар'і дружная … . Ба́цьку дзяўчынкі завуць … . Маці — … . Ёсць у Мар'і сястра … .

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: сям..я, Мікалай Васіл..евіч, Дар..я Пятроўна, Ул..янка.

**124.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

І ў вераб..я свая сям..я.

Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў: раздзяляльны ***ь*** ці апостраф? Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.



Правообладатель Национальный институт образования



**125.** Адгадайце загадку. З «рассыпаных» складоў складзіце слова-адгадку.




Голас тонкі, нос доўгі. Хто яго заб..е, сваю кроў прал..е.

Спішыце, устаўце замест пропускаў раздзяляльны ***ь*** або апостраф.

**126.** Адгадайце загадку.




За нас раней ён устае  
і звонкі голас падае.  
Звініць настойліва, вясёла:  
— Пад’ём! Цябе чакае школа.

*Н. Галіноўская.*

Запішыце слова-адгадку, падзяляючы яго для пераносу. Як падзяліць для пераносу слова *пад’ём*?

Апостраф (’), як і мяккі знак (ь), пры пераносе не аддзяляецца ад папярэдняй літары: *пад’-ём, Уль-яна.*



Правообладатель Национальный институт образования

**127.** Прачытайце. Што трэба ўставіць у словы замест пропускаў?

Паштал..ён, Дар..я, звяр..ё, б..ецца, міл..ён, л..ецца.

Выпішыце спачатку словы з раздзяляльным ***ь***, потым з апострафам, падзяляючы іх для пераносу.

**128.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Напалоханая варона і **вераб'я** баіцца.
**Здароўе** мілейшае за грошы.

Растлумачце правапіс выдзеленых слоў. Падзяліце іх для пераносу. Запішыце другую прыказку пад дыктоўку настаўніка.

**129.** Прачытайце сказы. Словы ў дужках змяніце так, як патрабуе сэнс.

Пер'е ў *(верабей)* шэрае.
Коні сытыя *(біць)* капытамі.
Сонца *(ліць)* сваё цяпло на зямлю.

Запішыце сказы, падзяляючы словы з апострафам для пераносу. Назавіце слова, якое нельга падзяляць для пераносу.



Правообладатель Национальный институт образования

**130.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.



… разносіць пошту. Ён зайшоў у … дома.

… купаюцца ў лужыне. Яны чысцяць сваё … .



Запішыце два сказы на выбар.



**131.** Спішыце сказ, устаўляючы ў словы патрэбны раздзяляльны знак.

Кураняты з **вераб..ямі** дружна п..юць вадзіцу з ямы.

Падзяліце для пераносу выдзеленае слова.

**132.** Прачытайце словы. Вызначце колькасць гукаў і літар у іх.

Канькі, песенька, медальён, бацька, мадэльер, Ілья, парцьера.

Выпішыце словы з раздзяляльным ***ь***. Падкрэсліце літары, паміж якімі ён пішацца.



Правообладатель Национальный институт образования

**133.** Размяркуйце словы ў два слупкі: у першы слупок запішыце словы з раздзяляльным ***ь***, у другі — з апострафам.

Міл..ён, кар..ер, пер..е, біл..ярд, надвор..е, шампін..ён, батал..ён, аб..езд.



***кар'е́р*** *— месца, дзе капаюць гліну, пясок*

**134.** Прачытайце загадку-рыфмаванку. Назавіце слова-адгадку.



**Вераб..іхі** з **вераб..ямі**
градкі ўспушваюць граблямі,
**вераб..яняты**
сеюць зярняты...
— Не работа — брак! —
гарлапаніць ... .

*В. Зуёнак.*

Выпішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу.



Гульня «Чароўныя фарбы» (словы з раздзяляльнымі знакамі).





Правообладатель Национальный институт образования

**135.** Дапоўніце сказ патрэбнымі словамі.

 падымае груз на будоўлі.

Запішыце сказ.



**136.** Спішыце народныя прыкметы. Устаўце ў словы патрэбны раздзяляльны знак або літару.

Калі бур..ян вырас высокім, будзе многа снегу.

Паяві́ліся ў лесе апен..кі — канец лета.

Падзяліце для пераносу слова з апострафам.

**137.** Прачытайце легенду.

## Адкуль назва горада

Там, дзе цяпер стаіць ***(Г/г)*омель**, пасярэдзіне ракі ***(С/с)*ож**, некалі было намыта шмат пяску. На беразе каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек. Каб плыты і лодкі не ўзбіваліся на мель, ён крыкам папярэджваў:

— Го! Мель! Го! Мель!

Вось і пайшло — *(Г/г)*омель.



Правообладатель Национальный институт образования

Адкуль у горада Гомеля такая назва?

**Рм** Што вы ведаеце пра паходжанне назвы свайго горада, вёскі?

Выпішыце выдзеленыя словы, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.

*па́мяць*

**138.** Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс ***е, ё — я***.

## Каб помнілі

Ад дз..доў, ад прадз..даў,
ад в..коў сівых
нам у памяць дадзена
слава дз..н былых.
Каб мы зналі-ведалі,
як даўней жылі,
над якімі бедамі
ўзрасці змаглі.

*В. Кажура.*

Спішыце першы сказ. Устаўце патрэбныя літары. Растлумачце правапіс ***д, дз***.

Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў вершы? Назавіце ў ім націскны склад. Колькі гукаў і колькі літар у слоўнікавым слове?



Правообладатель Национальный институт образования

**139.** Прачытайце словы, запісаныя па-руску. Перакладзіце іх на беларускую мову і запішыце.

Крючок, машина, живот, цимбалы, цех.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя гукі і галосныя пасля іх.

**140.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх словы, якія адрозніваюцца адным гукам. Якімі літарамі адрозніваюцца гэтыя словы?

Я свой вывадак вяду на крынічную ваду. Каля саду на лавачку сяду. *(Н. Старажава.)*

**141.** Прачытайце словы. Сфармулюйце заданне да практыкавання і выканайце яго.

1. Тра..ка, ласта..ка, аквары..м, во..к.
2. Стр..ла, кр..пасць, к..цяня, т..атр.
3. Насе..е, ка..ектыў, кало..е, бага..е.

Якія правілы вы прымянілі, каб правільна запісаць словы? Назавіце лішняе слова ў кожным радзе. Растлумачце свой выбар.



Правообладатель Национальный институт образования



**142.** Адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце і запішыце слова-адгадку.

Над зямлёю, над в..дою
тр..се белай бар..дою.
А як с..нейка ўсміхнецца,
ён р..сою разал(*ь*/*’*)ецца.

*А. Прохараў.*




Якія літары трэба ўставіць на месцы пропускаў? Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі. Запішыце слова з раздзяляльным знакам.

## Адкажыце на пытанні

1. Як абазначаюцца гукі на пісьме?
2. Якія словы пішуцца з вялікай літары?
3. Чым адрозніваюцца гукі [ў] і [у]? Калі пішацца літара ***ў***?
4. Як вызначыць, колькі складоў у слове?
5. Раскажыце правіла правапісу літар ***о, э — а*** ў беларускай мове. Прывядзіце прыклады.
6. Раскажыце правіла правапісу літар ***е, ё — я***? Прывядзіце прыклады.



Правообладатель Национальный институт образования

7. Як абазначаецца мяккасць зычных гукаў на пісьме?

8. Назавіце зацвярдзелыя зычныя гукі.

9. Як праверыць правапіс слоў з парнымі звонкімі ці глухімі гукамі ў канцы ці ў сярэдзіне слова?

10. Якія зычныя гукі ў беларускай мове могуць падаўжацца? Як абазначаюцца падоўжаныя зычныя гукі на пісьме? Прывядзіце прыклады.

11. Калі ў словах пішацца апостраф, а калі — раздзяляльны ***ь***?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якіх старонках вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?

Правообладатель Национальный институт образования

# СЛОВА

## Значэнне слова

**143.** Назавіце адным словам.

| | |
|---|---|
| Асобнае памяшканне з плітой для гатавання ежы. | *спальня* |
| Пакой, у якім спяць. | *ложак* |
| Будынак для жылля. | *кухня* |
| Мэбля, прызначаная для таго, каб на ёй спаць. | *дом* |

**Завяжы вузялок!**

Людзі карыстаюцца словамі для называння прадметаў, з'яў навакольнага свету, дзеянняў, якасцей. Кожнае слова мае пэўнае значэнне.

**Успомніце**

У якім парадку размяшчаюцца словы ў слоўніках?



Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

У **руска-беларускім** слоўніку побач з рускім словам даецца яго пераклад на беларускую мову. Напрыклад: ***ко́мната*** — ***пако́й***. У **беларуска-рускім** слоўніку побач з беларускім словам даецца яго пераклад на рускую мову. Напрыклад: ***падло́га*** — ***пол***.

**144.** Пры дапамозе слоўніка перакладзіце словы *ковёр, диван, дверь, зеркало* на беларускую мову. Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй?

Выраб з варсістай тканіны, які кладзецца на падлогу.

Мяккая мэбля са спінкай і падлакотнікамі.

Праём у сцяне для ўваходу і выхаду.

Гладкая бліскучая паверхня, здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёй.

***дзве́ры***

Запішыце слова *дзверы* разам з яго значэннем. Што яшчэ называюць дзвярамі?

Дзверы — … .



Правообладатель Национальный институт образования

**145.** Прачытайце і адгадайце загадку. Запішыце слова-адгадку.



Хто ні ідзе, я прыпыня́ю,
падаваць руку змуша́ю,
маю вочка і званок,
маю моцны я замок.
Толькі ва́ртаму даве́ру
гаспадар адчыніць ... .

*А. Герашкова.*



***ва́рты даве́ру*** — *той, каму можна давяраць*

**146.** Адгадайце загадку. Перакладзіце слова *прысады* на рускую мову.



**Д**омік летні ля прысад,
**а**гарод і спеўны сад
**ч**аста вельмі клічуць нас
**а**дпачыць у вольны час.

*У. Мазго.*

Спішыце загадку. У словах другога радка падкрэсліце літары, напісанне якіх трэба праверыць. Вусна падбярыце праверачныя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

**147.** Прачытайце. Чым адрозніваюцца словы? Ці аднолькава яны пішуцца?

за́мкі — замкі́

Вусна дапоўніце сказы.

Палацы, у якіх жывуць каралеўскія асобы, — гэта ... .

Прыстасаванні для таго, каб зачыняць што-небудзь ключом, — гэта ... .

**Рм** Прывядзіце прыклады слоў, якія супадаюць у напісанні, але адрозніваюцца націскам у вымаўленні.



**148.** Прачытайце і адгадайце загадку. Звярніце ўвагу на выдзеленыя літары.



**Я** з металу **рукі** маю,
карабель за нос трымаю.
**А** апусцяць — тры **рукі**
**р**азгарну на дне ракі.

*У. Мацвеенка.*

Спішыце загадку. Чым адрозніваюцца выдзеленыя словы?



Правообладатель Национальный институт образования

## Словы, якія называюць прадметы

**149.** Разгледзьце малюнак.



Адкажыце на пытанні.
Што вы бачыце на малюнку?
Хто будуе дом?

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *сцены, будынак, дах, вокны, кран, кранаўшчык, інжынер, будаўнік.*

Што абазначаюць гэтыя словы?

Словы, якія называюць прадметы, адказваюць на пытанні х т о? ш т о?: *шафёр, урач, машына, цукерка.*



Правообладатель Национальный институт образования

**150.** Замест кропак устаўце патрэбныя словы. Растлумачце правапіс выдзеленых літар і апострафа. Запішыце дзве групы слоў на выбар.

Мэбля (ш т о?): ... , ... , ... .
Людзі (х т о?): ... , ... , ... .
Птушкі (х т о?): ... , ... , ... .
Гародніна (ш т о?): ... , ... , ... .

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *вераб'і, шафа, дзяўчынка, будаўнік, ластаўкі, цыбуля, канапа, ложак, гарбуз, сусед, гракі, морква.*

У з о р. *Мэбля* (ш т о?): *шафа, канапа, ложак.*

## Успомніце з урокаў рускай мовы

Да якіх слоў ставіцца пытанне х т о?, а да якіх — ш т о?

Што абазначаюць гэтыя словы?

Словы, якія называюць людзей і жывёл, адказваюць на пытанне х т о?: *тата, леў.*

Усе астатнія словы — назвы прадметаў адказваюць на пытанне ш т о?: *стол, снег.*



Правообладатель Национальный институт образования

**151.** Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.



Маленькая нерухомая ... — гэта лесвічка.



Прыстаўная ... — гэта драбі́ны.

Запішыце другі сказ. Падкрэсліце ў ім словы, якія называюць прадметы.

*ле́свіца*

**152.** Замяніце адным словам.

1. Чалавек, які працуе на будоўлі.
2. Вадзіцель аўтамабіля.
3. Рад прыступак для пад'ёму і спуску.
4. Прылада для капання зямлі.









Запішыце словы. У дужках пастаўце да іх пытанні. Падкрэсліце слоўнікавае слова.

У з о р: (х т о?) *будаўнік.*



Правообладатель Национальный институт образования

**153.** Прачытайце прыказку. Калі так гавораць?

**Вочы баяцца, а рукі робяць.**

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць прадметы.



**154.** Выпішыце спачатку словы, якія адказваюць на пытанне *к т о?*, пасля выпішыце словы, якія адказваюць на пытанне *ш т о?*

**Стадыён, кватэра, матуля, дзядуля, медаль, дождж, мядзведзь, птушка.**

**155.** Разгадайце рэбус і дапоўніце сказ слоўнікавым словам.



**Рухомая ... ў м..тро — гэта эскала́тар.**

Запішыце, устаўляючы прапушчаную літару. Падкрэсліце ў сказе словы, якія абазначаюць прадметы. Вусна пастаўце да іх пытанне.



Правообладатель Национальный институт образования

**156.** Прачытайце верш. Якую літару або знак трэба ўставіць у выдзеленае слова?

Вожыкі ў футбол гуляюць,
яблык, быццам мяч, ганяюць.
Вожык-тата — варатар,
**адаб(ь/’)е** любы ўдар!

*Т. Мушынская.*

Спачатку выпішыце з верша словы, якія адказваюць на пытанне х т о?, потым — на пытанне ш т о?

**157.** Прачытайце. Знайдзіце ў кожным радзе слоў лішняе. Растлумачце свой выбар.

Урач, міліцыянер, прадавец, магазін.
Мячык, пірамідка, дзіця, кубікі.
Вавёрка, казуля, лес, ліса.
Машына, цягнік, тралейбус, машыніст.

Запішыце астатнія словы ў кожным радзе. На якія пытанні яны адказваюць?



Гульня «Складзі расклад».





Правообладатель Национальный институт образования

**158.** З прапанаваных літар складзіце і запішыце словы. Якія з іх адказваюць на пытанне к т о?, а якія — на пытанне ш т о?

т, к, о





л, к, о, с, а





н, к, і, о





Падкрэсліце літары ў словах, напісанне якіх трэба правяраць. Вусна падбярыце праверачныя словы.

З адным словам на выбар складзіце сказ.



**159.** Прачытайце верш.



**Скрыпка**

Чароўная скрыпка,
чароўны смычок!
Сыграй нам, Кастусёк,
пра ціхі куток,



Правообладатель Национальный институт образования

дзе возера дрэмле,
лілéі цвітуць
і белыя лебедзі
вольна жывуць.

*Е. Лось.*

Спішыце. Падкрэсліце словы, якія называюць прадметы.

## Прыназоўнік

**Успомніце з урокаў рускай мовы**

Як называюцца словы, якія служаць для сувязі слоў у сказе?

| **па-беларуску** | **па-руску** |
| --- | --- |
| прыназоўнік | предлог |

**160.** Разгледзьце малюнкі. Дзе сядзіць кот?



Кот сядзіць ... дрэве.

Кот сядзіць ... дрэвам.



Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі словамі, каб іх сэнс стаў зразумелым.

Для чаго служыць прыназоўнік у сказе?



Правообладатель Национальный институт образования

Прыназоўнікі ***у, на, над, з, за, з-за, да, ад, па, пад*** служаць для сувязі слоў у сказе. Яны пішуцца асобна ад іншых слоў у сказе: *Унук паехаў да бабулі.*

Рм **161.** Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Якая пара года на ёй адлюстравана?



Адкажыце на пытанні, выкарыстайце словы для даведкі.

Што паказалася **з-за** воблакаў?
**Ад** чаго вызвалілася рэчка?
Дзе яшчэ ляжыць снег?
Што прабіваецца з зямлі?



Правообладатель Национальный институт образования

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *ад лёду, сонейка, на палях, першая траўка.*

Адказы запішыце. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**162.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

Сакавік з в..дой, красавік з трав..й, май з кветкамі.

У сакавіку куры нап..юцца з лужыны.

Спішыце сказы. Устаўце патрэбныя літары або знак, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

**Гаварыце правільна**

прыйсці са школы

пайсці ў *(па)* грыбы, пайсці ў *(па)* ягады

**163.** Адкажыце на пытанні.

| | |
|---|---|
| Куды мама ходзіць па ягады? | *з татам* |
| З кім ты любіш хадзіць у грыбы? | *з мамай* |
| | *на рынак* |
| | *з бабуляй* |

Адзін з адказаў запішыце. Падкрэсліце ў сказе прыназоўнікі.



Правообладатель Национальный институт образования



**164.** Прачытайце, спішыце. Устаўце патрэбныя літары, растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце прыназоўнікі.

Засп*(е/я)*ваў жаваранак. З лесу павеяла хала*(д/т)*ком. Узышло на небе сонца.

## Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**165.** Падбярыце да слоў-назваў іх прыметы.

| | |
|---|---|
| Журавіны | *круглы, румяны, салодкі, сакавіты* |
| Вавёрка | *вялікае, глыбокае, празрыстае, блакітнае* |
| Яблык | *рыжая, маленькая, жвавая, пушыстая* |
| Возера | *буйны́я, чырвоныя, кіслыя, карысныя* |

Ад слоў левага слупка пастаўце пытанні да слоў правага слупка.

Запішыце, якім бывае яблык.



Правообладатель Национальный институт образования

Словы, якія называюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я?: *белы* (снег), *вясёлая* (усмешка), *цёплыя* (дні), *лагоднае* (сонейка).

**166.** Прачытайце верш.

Я вясну малюю,
фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным —
дрэва і палеткі,
колерам чырвоным —
сонейка і кветкі,
колерам блакітным —
неба, ручаіну.
А якую фарбу
воблачку пакіну?

*П. Прануза.*

Якія колеры пераважаюць вясной? Якога колеру воблачка?

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Выпішыце ў алфавітным парадку словы — назвы колераў вясны.



Правообладатель Национальный институт образования

**167.** Адгадайце загадку.




Хмара дробны дожджык сее,
сонца ярка свеціць,
у сем колераў квітнее
што? — Скажыце, дзеці.

*У. Мацвеенка.*

Знайдзіце ў загадцы слова, якое называе прымету прадмета. Назавіце колеры вясёлкі.

**168.** Прачытайце. Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

*цвёрды*

Сцежка (я к а я?) вузкая, а дарога ... .
Снег (я к і?) мяккі, а лёд ... .
Перац (я к і?) горкі, а цукар ... .
Дрэва (я к о е?) высокае, а куст ... .

С л о в ы д л я д а в е д к і: *шырокая, салодкі, нізкі, цвёрды.*

Запішыце сказ, у якім сустрэліся слоўнікавыя словы. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў.

У з о р. *Сцежка вузкая, а дарога шырокая.*



Правообладатель Национальный институт образования

**169.** Па прыкметах адгадайце, пра што гаворыцца ў загадцы.





З*(е/я)*лёны мех,
а ў ім — чырвоны сне*(г/х)*.
*А. Клышка.*

Спішыце загадку, устаўляючы патрэбныя літары ў словы.

У класе або дома праверце па перакладным слоўніку, ці правільна вы назвалі слова-адгадку.

**170.** Да слоў — назваў прымет прадметаў падбярыце словы — назвы прадметаў. Запішыце спалучэнні слоў па ўзоры.



летняя чырвоная шаўковая ...



маленькае чорнае гуллівае ...



новы пругкі футбольны ...



прыгожыя дзіцячыя сонечныя ...

У з о р: *летняя чырвоная шаўковая сукенка, ...*



Правообладатель Национальный институт образования

**171.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

**Летні дзень год корміць.**

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах. Запішыце прыказку пад дыктоўку настаўніка.

Падкрэсліце слова, якое абазначае прымету прадмета. Вусна пастаўце да яго пытанне.

**172.** Прачытайце. Выберыце з дужак словы, якія дапамагаюць апісаць летняе надвор'е.

### Летам

Быў *(цёплы/халодны)* дзень. Стаяла *(сонечнае/пахмурнае)* надвор'е. Дзеці пабеглі на рэчку. Яны купаліся ў *(цёплай/сцюдзёнай)* вадзе.

Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў. Вусна пастаўце да іх пытанні.

**173.** Да слоў з правага слупка падбярыце словы з левага слупка.

| | |
|---|---|
| сырое | *плашч* |
| мокры | *надвор'е* |



Правообладатель Национальный институт образования

| | |
|---|---|
| духмяная | *бэз* |
| пахучы | *булка* |
| старажытная | *крэпасць* |
| старое | *вядро* |

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

1. У ... надвор'е лепш пасядзець дома. 2. У кветніку расцвіў ... бэз. 3. У час экскурсіі дзеці наведалі ... крэпасць.

Запішыце два сказы на выбар. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў. Вусна пастаўце да іх пытанні.



**174.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі. Выкарыстайце словы для даведкі.

Наляцеў ... вецер. Неба зацягнулі ... хмары. Заблісказі ... маланкі. Раскацíста прагрымеў гром. Як з вядра паліў ... ... дождж.

Словы для даведкі: *моцны, яркія, чорныя, цёплы, летні.*

Запішыце тэкст. Падкрэсліце словы, якія называюць прыметы прадметаў.



Правообладатель Национальный институт образования

## Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

**175.** Да слоў з левага слупка падбярыце па сэнсе словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Дзеці (ш т о  р о б я ц ь?)… . | *свішча*<br>*вые*<br>*дзьме* |
| Вецер (ш т о  р о б і ц ь?)… . | *свеціць*<br>*грэе*<br>*прыгравае* |
| Сонейка (ш т о  р о б і ц ь?)… . | *бегаюць*<br>*гуляюць*<br>*катаюцца* |

Што абазначаюць словы з правага слупка?

Словы, якія называюць дзеянні прадметаў, адказваюць на пытанні ш т о  р а б л ю?  ш т о  р о б і ш?  ш т о  з р а б л ю?  ш т о  з р о б я ц ь?  і  і н ш.: *чытаю, чытаеш, напішу, напішуць.*



Правообладатель Национальный институт образования

**176.** Скажыце, хто які голас падае́.


*каркае*


*мяўкае*


*гагоча*


*вые*

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

У з о р. *Варона каркае.*

Вусна адкажыце, як рухаюцца гэтыя жывёлы.

**177.** Прачытайце. Адгадайце загадку. Скажыце, якія словы падказалі вам адгадку.

## Хто гэта?

Тра*(у/ў)*ку скубе, жвачку ж*(у/ў)*е, пойла п’е, мы́кае і раве, гаспадыню заве.

Спішыце, устаўце ў словы патрэбныя літары. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні.



Правообладатель Национальный институт образования

**178.** Прачытайце прыказкі. Якіх людзей паважаюць: працавітых ці балбатлівых?

Справы словамі не заменіш.
Не ад красных слоў дабро на свеце стала.

Назавіце ў прыказках словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

Запішыце першую прыказку па памяці.

**179.** Прачытайце сказы ў парадку ўзрастання хуткасці руху. Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянне прадметаў.

Чалавек **ідзе**. Чарапаха **паўзе**. Машына **імчыцца**. Самалёт **ляціць**. Конь **бяжыць**.



**180.** Прачытайце скорагаворку.

Спрытна кроп
палоў Пракоп.
Лёг пад кропам
і захроп.

*В. Вітка.*



***кроп*** — рус. *укро́п*

Спішыце, падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянні прадмета. Вусна пастаўце да іх пытанні.



Правообладатель Национальный институт образования

**181.** Да слоў — назваў дзеянняў прадметаў падбярыце словы — назвы прадметаў. Запішыце сказы па ўзоры.





… цырыкае, лятае, дзяўбе.

… пасецца, мэ́кае, скача.



… скача, бегае, іржэ́.

Узор. *Верабей цырыкае, лятае, дзяўбе.*



Гульня «Складзі пазл».



**182.** Прачытайце загадку і адгадайце яе.

Гняз*(д/дз)*ечка не будуе
і *(д/дз)*етак не гадуе.
Такая вось матуля,
заву*(т/ц)*ь яе — … .

*Л. Багдановіч.*

Запішыце загадку разам з адгадкай, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета.



Правообладатель Национальный институт образования

**183.** З прапанаваных частак складзіце прыказкі. Чаму так гавораць?

| | |
|---|---|
| Воўка | бачыць здаля́. |
| Рыбак рыбака | ногі кормя**ць**. |

***здаля́*** — *здалёк, здалёку*

Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце адну прыказку на выбар. Падкрэсліце ў ёй слова, якое абазначае дзеянне прадмета.

**184.** Прачытайце сказы. Знайдзіце ў іх словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета.

Дзяўчынка смяецца. Хлопчык бяжыць. Вада льецца. Дзеці скачуць.

Дапоўніце гэтымі словамі сказы пад малюнкамі.



У небе … сонейка.



Сцяжынка … па лесе.



Правообладатель Национальный институт образования



… прыгожая
песня.



… дажджавыя
кроплі.

Запішыце адзін сказ на выбар. Падкрэсліце ў ім слова, якое абазначае дзеянне прадмета.



**185.** Адгадайце загадкі.





1. Адзін л..е, другі п..е, трэці зелянее і расце.
2. Зімою хаваюся, вясною з..яўляюся, летам весялюся, восенню спаць кладуся.

Спішыце адну загадку на выбар. Устаўце ў словы замест пропускаў раздзяляльны ***ь*** або апостраф. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета.



Правообладатель Национальный институт образования

## Адкажыце на пытанні

1. На якія пытанні адказваюць словы, што называюць прадметы?

2. Для чаго служаць прыназоўнікі? Як яны пішуцца з іншымі словамі?

3. На якія пытанні адказваюць словы, што называюць прыметы прадметаў?

4. На якія пытанні адказваюць словы, што называюць дзеянні прадметаў?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якіх старонках вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?

Правообладатель Национальный институт образования

# СКАЗ

**186.** Знайдзіце сярод прапанаваных спалучэнняў слоў сказ. Па якіх прыметах вы вызначылі, што гэта сказ? Выпішыце сказ.

Таня, спячы, торт, для, свой, матуля.

Таня спякла торт для...

Таня спякла торт для сваёй матулі.



Сказ выражае закончаную думку.

Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка (.), пытальнік (?) або клічнік (!).

**187.** Выразна прачытайце верш.

— Што, сябры, для жыта трэба?
— Ну, вядома, трэба глеба.



Правообладатель Национальный институт образования

— А для птушкі?
— Вышыня.
— А для казкі?
— Цішыня.
— Ну, а што для весялосці?
— Каб часцей бывалі госці!

*М. Гелер.*

Знайдзіце і прачытайце сказы-пытанні. Які знак стаіць у канцы гэтых сказаў?

Знайдзіце і прачытайце сказы-адказы. Які знак стаіць у канцы гэтых сказаў?

Знайдзіце сказ, які трэба чытаць з моцным пачуццём. Які знак стаіць у канцы гэтага сказа?

У якіх сказах больш за ўсё слоў? У якіх сказах менш за ўсё слоў?

**188.** Прачытайце. Колькі тут сказаў? Спішыце, правільна афарміце сказы на пісьме.

Цётка Паўліка жыве ў вёсцы летам хлопчык ездзіць да яе ў госці там у Паўліка ёсць сябры ён ходзіць разам з імі на рыбалку

**Рм** Раскажыце, як вы адпачываеце летам.



Правообладатель Национальный институт образования

**189.** Прачытайце. Чаму гэтыя словы нельга назваць сказам?




Расстаўце словы ў патрэбным парадку.

Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе. Растлумачце правапіс літар ***у*** і ***ў***. Запішыце скорагаворку па памяці.

**190.** Прачытайце прыказку.

Адклад не ідзе на лад.

Колькі слоў у сказе?
Растлумачце правапіс выдзеленых літар.
Запішыце прыказку пад дыктоўку.



**191.** Вызначце межы сказаў.

Ранкам у лесе пахнуць кветкі на розныя галасы заліваюцца птушкі

Спішыце. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.



Правообладатель Национальный институт образования

**192.** Да слоў з левага слупка падбярыце словы з правага слупка.

| | |
|---|---|
| Ружы ... . | *спявае* |
| Шпакі ... . | *чытае* |
| Хлопчык ... . | *цвітуць* |
| Дзіця ... . | *спіць* |
| Дзяўчынка ... . | *прыляцелі* |

Запішыце 3 сказы на выбар.

Пра каго гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.

Узор. *Ружы цвітуць.*

**193.** Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі.

... ловіць мышэй.
... растае́ вясной.
... лечыць людзей.

Спішыце сказы. Пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе? Падкрэсліце гэтыя словы адной рыскай. Што пра іх гаворыцца? Падкрэсліце гэтыя словы дзвюма рыскамі.



Правообладатель Национальный институт образования

Рм **194.** З асобных слоў складзіце сказы.

Коля, клас, спяшаўся, ў.
У, хлопчык, калідоры, настаўніцу, сустрэў.
Коля, ёй, з, павітаўся.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.

Якімі словамі можна вітацца з настаўніцай? З сябрамі?

*калідо́р*

## Гаварыце правільна

Павітацца з настаўніцай, дзякаваць бабулі, дараваць сябру.

**195.** Адкажыце на пытанні.

З кім павіталася Таня ў школе?





Правообладатель Национальный институт образования



Каму дзяўчынка хутка даравала крыўду?



Каму падзякавала Таня за смачную вячэру?



**196.** З асобных слоў складзіце сказы.

Увесну, пад, фіялка, расцвіла, ліпаю.
За, прыгожы, раскінуўся, домам, парк.

Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў кожным сказе.

**197.** Размясціце радкі верша Ніны Галіноўскай «Хітры павучок» па парадку.

| | |
|---|---|
| 1. | На травінках павучок |
| ? | — Прылятайце, мухі, мошкі, |
| ? | выткаў тонкі гамачок. |
| ? | і пагушкайцеся трошкі. |



Правообладатель Национальный институт образования

Спішыце першы сказ. Назавіце ў ім словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**198.** Расстаўце словы ў патрэбным парадку. Запішыце сказы.

Увесь, сонца, дзень, свеціць.
У, пабеглі, ручайкі, хуткія, дварах.

Падкрэсліце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. У другім сказе назавіце прыназоўнік.

**199.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Надыходзяць ц..плыя дз..нькі св..ціць ласкавае сон..йка зазел..нела маладая траўка сп..ваюць галасістыя птушкі

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце правапіс літар ***е, ё — я.***

Спішыце. Назавіце ў сказах словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.


Правообладатель Национальный институт образования

**200.** Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

Лета збірае, а зіма праядае.
Лянок не любіць ляноты.

Колькі слоў у сказах? Спішыце сказ з чатырох слоў. Падкрэсліце ў ім словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



**201.** З асобных слоў складзіце і запішыце сказы.

Дзеці, лес, прыйшлі, у.
Тут, ландышы, цвітуць.
Прыгожа, птушкі, спяваюць.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**202.** Дапоўніце сказы па пытаннях і запішыце.

д з е?

Дрэвы растуць ... .

я к а я?

Смяецца ... дзяўчынка.



Правообладатель Национальный институт образования

к а л і?        я к і?

... пачаўся ... дождж.

С л о в ы  д л я  д а в е д к і: *у лесе, маленькая, раніцай, моцны.*

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца.

**Рм 203.** Вусна дапоўніце сказы тэксту па пытаннях.



Добра сонечным днём на вуліцы. Дзяўчынкі катаюцца (н а  ч ы м?) на ... . Хлопчыкі гуляюць (у  ш т о?) у ... . Малыя гушкаюцца (н а  ч ы м?) на ... .

У другім сказе назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**204.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

1 2

Стройныя кедры дрыжаць на ветры. *(С. Шах.)*

Назавіце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

Вусна пастаўце па стрэлках пытанні да астатніх слоў у сказе. Зрабіце гэта ў той паслядоўнасці, якую падказваюць лічбы над стрэлкамі.

**205.** Прачытайце.

1. Каля клёна расце возера. 2. Павел выразна чытае верш. 3. Цікавая канапа ляжыць на кнізе. 4. Наташа намалявала прыгожую кветку.

Назавіце сказы, у якіх дапушчаны сэнсавыя памылкі. Выправіце памылкі і запішыце сказы.

У запісаных сказах падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца. Ад падкрэсленых слоў вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.



Правообладатель Национальный институт образования

 **206.** Прачытайце. Вызначце межы сказаў.

Прыйшла вясна школьны сад стаіць у зялёным убранні лёгкі ветрык калыша дрэвы

Спішыце. Правільна афарміце сказы на пісьме.

Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго або пра што гаворыцца ў кожным сказе і што гаворыцца. Вусна пастаўце пытанні да астатніх слоў у сказах.

## Адкажыце на пытанні

1. Што выражае сказ?
2. З якой літары трэба пісаць першае слова ў сказе?
3. Якія знакі прыпынку ставяцца ў канцы сказа?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якой старонцы вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?



Правообладатель Национальный институт образования

# ТЭКСТ

## Успомніце з урокаў рускай мовы

З чаго складаецца тэкст?

**207.** Прачытайце дзве групы сказаў.

I. Мы хадзілі ў грыбы. Я сустрэла сяброўку Таню. Бабуля згатавала грыбны суп. Вавёрка збірае грыбы і запасае іх на зіму.

II. Сяргейка ўлетку часта хадзіў у грыбы. Шмат грыбоў было ў лесе. Кожны грыб ён акуратна зразаў. Хлопчык вяртаўся дамоў задаволены.

У якой групе, першай ці другой, сказы звязаны па сэнсе? Якую групу можна назваць тэкстам? Пра каго расказваецца ў тэксце?

Некалькі сказаў, звязаных паміж сабой па сэнсе, называюцца тэкстам.



Правообладатель Национальный институт образования

**208.** Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Там тата з сынам убачылі шмат розных звяроў і птушак.

Вася прачнуўся рана.

Яны паехалі ў заапарк.

Хлопчык устаў, паснедаў і пайшоў з татам на аўтобусны прыпынак.

Запішыце тэкст. У першым сказе падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра каго гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.

**209.** З асобных слоў вусна складзіце сказы.

Лёня, са, вяртаўся, школы. Раптам, убачыў, ён, кацяня, маленькае. Яно, мяўкала, жаласна. Хлопчык, яго, падняў, і, дамоў, прынёс. Цяпер, жыве, ў, кацяня, Лёні.



Ці ўтвараюць сказы тэкст? Чаму?

Назавіце ў сказах прыназоўнікі.



Правообладатель Национальный институт образования

**210.** Прачытайце тэкст. Якую ён мае назву? Колькі ў ім сказаў?

### Мая градка

Я на дачы маю **градку**,
даглядаю сам яе.
Раскажу **вам** па **парадку**,
што на ёй цвіце-расце:
**мак**, **часнок**, **гарох**, салата,
па баках — і **кроп**, і мята.

*Н. Галіноўская.*

Назавіце тыя выдзеленыя словы, у якіх трэба праверыць напісанне парных звонкіх — глухіх зычных. Вусна падбярыце да іх праверачныя словы.



**211.** Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Добра іграў на ёй камарык у арэшніку. Была ў камарыка скрыпачка. Тут і ветрык яму падпяваў, і сябры-камарыкі. Цэлы аркестр атрымаўся.

Спішыце першыя два сказы тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

**212.** Прачытайце тэкст.



Мядзведзь любіць лавіць рыбу. Ён доўга можа сядзець у вадзе і чакаць. Вось плыве вялікі ласось. Мядзведзь лоўка хапае яго лапай і выкідвае на бераг.

Пра каго расказваецца ў тэксце? Што аўтар хацеў сказаць пра мядзведзя?

З прапанаваных загалоўкаў выберыце той, які найбольш падыходзіць да тэксту: «Мядзведзь», «Добры рыбак», «Рыбалка». Дакажыце, што ваш выбар правільны.

**Завяжы вузялок!**

Сказы ў тэксце аб’яднаны тэмай і асноўнай думкай.

**Тэма** — гэта тое, пра што гаворыцца ў тэксце.

**Асноўная думка** — гэта галоўнае, пра што аўтар хоча сказаць чытачу.

На тэму або асноўную думку можа ўказваць загаловак тэксту.



Правообладатель Национальный институт образования

**213.** Прачытайце загаловак тэксту. Як вы думаеце, на якую тэму (пра што) гэты тэкст?

Падзяліце тэкст на сказы. Ці падказаў вам загаловак тэму тэксту?

## Дружок

На лесвіцы скуголіла шчаня я ўзяў яго і прынёс дамоў шчаня хутка прывыкла да мяне я назваў яго Дружок пазней Дружок стаў маім верным сябрам

Запішыце тэкст, правільна афармляючы сказы на пісьме.

**214.** Прачытайце тэкст.

## Сапраўдны сябар

Быў у Мішы сабачка Шарык. Міша і Шарык заўсёды гулялі разам. Аднойчы хлопчык з сабакам пайшоў на рэчку. Міша падышоў блізка да вады. Раптам ён паслізнуўся і ўпаў у раку. Шарык кінуўся ў ваду. Ён схапіў Мішу за кашулю і пацягнуў да берага. Так Шарык выратаваў свайго сябра.



Правообладатель Национальный институт образования



Пра што гэты тэкст? На тэму ці на асноўную думку тэксту ўказвае загаловак?

**215.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

**Ча**лавек без с**я**броў — што дрэва без **ка**ранёў.

Пры́яц**е**ля пазнаеш у н**я**шчасці.

Лепш адзін прыяцель, чым дз**е**сяць в**о**рагаў.

Якая прыказка дапамагае выказаць асноўную думку тэксту з практыкавання 214? Назавіце ў ёй прыназоўнік.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар у словах.



Правообладатель Национальный институт образования



**216.** Пастаўце сказы ў патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Вучні часта прыходзяць да яго пасля ўрокаў. У нашай вёсцы жыве старэнькі дзядуля. Дзядуля вельмі ўдзячны маленькім памочнікам. Дзеці падмятаюць падлогу, носяць ваду.

Які загаловак найбольш падыходзіць да тэксту: «Дзядуля», «Маленькія памочнікі»?

Запішыце першыя два сказы тэксту.

**217.** Прачытайце тэкст.

Напалі на сасну чарвякі і вусені. Захварэла сасна. Пачалі жоўкнуць і асыпацца шыпулькі.

Прыляцеў да дрэва стракаты дзяцел. Потым з'явілася маленькая птушка каралёк. Яна заняла верхнія тонкія галінкі. Сінічкі з чорнымі галоўкамі прымасціліся ніжэй. Яшчэ ніжэй прыселі сініцы ў беленькіх шапачках. Калупа́ў дзюбай у кары попаўзень. Усім птушкам хапіла работы.



Правообладатель Национальный институт образования

Вы́ратавалі дрэва санітары лесу. Сасна была ўдзячная птушкам.

***шыпу́лькі*** — рус. *иго́лки* (у хвойных растений)
***страка́ты*** — рус. *пёстрый*

Пра што гэты тэкст? Які загаловак найбольш падыходзіць да тэксту: «Хворая сасна», «Санітары лесу», «Дапамога сасне»?

На што ўказвае загаловак: на тэму ці на асноўную думку тэксту?

Для чаго тэксту патрэбны загаловак?

**218.** Выберыце з тэксту практыкавання 217 сказы, якімі можна падпісаць кожны малюнак.

Падбярыце загаловак да кожнай групы сказаў.









Правообладатель Национальный институт образования

Рм **219.** Адкажыце на пытанні да тэксту. Выкарыстайце прапанаваныя словы.

1. Што здарылася з сасной?
2. Хто прыляцеў да сасны?
3. Што зрабілі санітары лесу?

С л о в ы  д л я  д а в е д к і:

1) *чарвякі і вусені, захварэла, пажоўклі шыпулькі;*

2) *стракаты дзяцел, каралёк, сінічкі з чорнымі галоўкамі, сінічкі ў белых шапачках, попаўзень;*

3) *выратавалі дрэва.*

Рм **220.** Пісьмова перакажыце тэкст практыкавання 217 па пытаннях.



**221.** Са слоў кожнага радка складзіце сказ.

Варо́ны, па́рках, у, сада́х, і, начу́юць.
Сіні́цы, пад, дамо́ў, даха́мі, хава́юцца.

Запішыце сказы. Правільна афарміце іх на пісьме.



Правообладатель Национальный институт образования

**222.** Прачытайце тэкст. Як сарокам удалося ўратавацца ад каршуна?

## Паветраны пірат

| | |
|---|---|
| У нашым двары расце шмат розных дрэў. Аднойчы тут пачуўся сарочы гвалт. | Пачатак |
| Я прыгледзеўся і ўбачыў на ясені каршуна. Сарокі з крыкам праносіліся над драпежнікам. Не кожная птушка ўратуецца ад гэтага паветранага пірата. Але на гэты раз каршуна атакавалі сарокі. Яны выганялі яго са сваёй тэрыторыі. Каршун не вытрымаў атакі сарок, узляцеў у паветра. Ён знік за высокім домам. | Асноўная частка |
| Сарокі супакоіліся. У нашым двары зноў стала ціха. *(Паводле У. Шулякоўскага.)* | Заключная частка (канцоўка) |

На колькі частак падзелены тэкст? Як яны называюцца? Аб чым ідзе размова ў кожнай частцы тэксту?



Правообладатель Национальный институт образования

**Завяжы вузялок!**

У тэксце вылучаюцца пачатак, асноўная частка, заключная частка (канцоўка).

**Пачатак** рыхтуе чытача да таго, пра што пойдзе размова далей.

**Асноўная частка** расказвае пра галоўнае.

**Заключная частка (канцоўка)** падагульняе сказанае.

**223.** Прачытайце прыказкі. Якая з іх падыходзіць да зместу тэксту з практыкавання 222 і дапамагае выказаць яго асноўную думку? Запішыце гэту прыказку, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

Што аднаму ця*(ж/ш)*ка, тое гуртам лё*(г/х)*ка.

Лепш сініца ў руках, як журавель пад небам.



***гу́ртам — суме́сна, усім разам***



Успомніце вядомую вам прыказку са словам *калектыў*, якая таксама падыходзіць да зместу тэксту «Паветраны пірат».



Правообладатель Национальный институт образования

**224.** Прачытайце. Што парушана ў тэксце?

Яны разам гуляюць, глядзяць мульцікі і сваволяць. Калі мамы няма на кухні, хлопчык тайком частуе коціка каўбасой. Мурзіку гэта вельмі падабаецца. Кожны раз ён удзячна муркае.

У Міколкі ёсць кот Мурзік.

Міколка і Мурзік — лепшыя сябры. *(Паводле Т. Крэнь.)*

Вусна аднавіце паслядоўнасць частак тэксту. Дайце яму загаловак.

Запішыце пачатак і канцоўку тэксту. Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах.

**225.** Прачытайце. Якая частка адсутнічае ў тэксце?

Хлопчыкі дапамагаюць дзеду даглядаць сад. Яны набіраюць у вядзерцы вады і паліваюць маладзенькія дрэўцы.

Дзед удзячны юным садоўнікам. Кожнае лета ён частуе ўнукаў яблыкамі і грушамі.

Прыдумайце пачатак тэксту і запішыце яго.



Правообладатель Национальный институт образования



**226.** Прачытайце тэкст. Якія брусніцы на смак? Чым яны карысныя?

## Брусніцы

Брусні́чнік рассцілаецца як зялёны дыван. І ўсюды, куды ні кінеш вачамі, чырванеюць ягады.

Пасп*(я/е)*ваюць брусніцы ў канцы жні*(у/ў)*ня. У гронцы бываюць і спелыя, і н*(я/е)*спелыя яга*(д/т)*кі.

Спелыя брусніцы трымаюць у вадзе. Тады яны доўга не губляюць сваю кіслінку і вітаміны. *(Паводле У. Ягоўдзіка.)*

Спішыце асноўную частку тэксту, устаўляючы ў словы патрэбныя літары.

**227.** Прачытайце тэкст. Якое захапленне ёсць у Рыты?

Рыта займаецца ў гуртку вышывальшчыц. Педагог прапанавала дзецям вышыць розных звяркоў. Рыта выбрала зайца.

Дзяўчынка па клетачках вышывала крыжыкам галаву, лапы, спіну, хвост. Яна старалася, але зрабіла некалькі лішніх



Правообладатель Национальный институт образования

крыжыкаў. Адно вуха ў зайца атрымалася даўжэйшым за другое. Рыта спачатку засмуцілася, а потым пачала расплятаць іголкай вышыўку. Пасля яна зноў вышывала па клетачках. Цяпер у зайца былі аднолькавыя вушы.



Пасля заканчэння працы вучні зрабілі выстаўку. Яе наведвальнікі дзівіліся, як прыгожа вышыла зайца маленькая майстрыха. *(Паводле М. Даніленкі.)*

Прачытайце частку тэксту, якой адпавядае малюнак.

Знайдзіце і прачытайце пачатак тэксту і канцоўку. Аб чым ідзе размова ў кожнай з гэтых частак?

Вызначце тэму тэксту.

**Рм** Раскажыце, які гурток або секцыю наведваеце вы. Чаму вы ўжо навучыліся на гэтых занятках?



Правообладатель Национальный институт образования

**228.** Прачытайце прыказкі. Якая з іх падыходзіць да зместу тэксту з практыкавання 227 і дапамагае выказаць яго асноўную думку? Запішыце гэту прыказку па памяці.

Па рабоце майстра відаць.
Рукі малы́я ды да працы ўда́лыя.

**229.** Прачытайце. Што парушана ў тэксце?

Раніцай каля будкі з'явіўся Тузік. Ён накінуўся на няпрошанага госця. Кацяня ўчапілася за сабачы хвост. Падняўся шум. З хаты выбеглі гаспадары. Дзядуля разняў забіяк. Пакрыўджаны сабака забіўся ў будку. Бабуля забрала кацяня ў хату і накарміла.

Па цёмнай дарозе бегла маленькае кацяня. Яно завярнула ў першы вясковы двор і вырашыла тут заначаваць. Кацяня залезла ў пустую сабачую будку.

Так і засталося яно жыць у бабулі з дзядулем. Праз некаторы час кацяня з Тузікам сталі сябрамі. *(Паводле Г. Нічыпаровіч.)*



Правообладатель Национальный институт образования

Аднавіце паслядоўнасць частак тэксту. Дайце яму загаловак.

Вусна перакажыце адноўлены тэкст.

**230.** Прачытайце пачатак і канцоўку тэксту.

## Адпачынак на Браслаўскіх азёрах

Сям’я Андрэйкі часта прыязджае на Браслаўскія азёры.






Бацькі і дзеці кожны раз з задавальненнем вяртаюцца на азёры.



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце малюнкі. Прыдумайце па іх тую частку тэксту, якой не хапае. Выкарыстайце наступныя словы і спалучэнні: *у сонечныя дні, дарослыя і дзеці, купаюцца ў возеры, ловяць рыбу, катаюцца на веласіпедах, па лясных дарожках, часта, плаваюць на лодцы.*

На што ўказвае загаловак: на тэму ці на асноўную думку тэксту?

Запішыце асноўную частку тэксту.



**231.** Прачытайце тэкст. Падзяліце яго на часткі.

## Ноч у лесе

Цемра паступова апускаецца на зямлю. У лесе зма*(у/ў)*каюць птушкі. Засынае ў сваім гняз*(д/дз)*е рыжая вавёрка. Хаваецца ў дупло працавіты *(д/дз)*яцел. У гэты час прачынаецца сава. Выхо*(д/дз)*іць на палява*(н/нн)*е драпежная рысь. Лес паступова напаўняецца таемным шумам і шорахам.

Запішыце асноўную частку тэксту, устаўляючы ў словы прапушчаныя літары.



Правообладатель Национальный институт образования

## Адкажыце на пытанні

1. З чаго складаецца тэкст?
2. Чым адрозніваецца тэкст ад набору сказаў?
3. На што можа ўказваць загаловак тэксту?
4. Што называюць тэмай тэксту?
5. Што называюць асноўнай думкай тэксту?
6. Якія часткі можна вылучыць у тэксце?

Пры адказе на якія пытанні ўзніклі цяжкасці? На якіх старонках вучэбнага дапаможніка можна знайсці адказы на гэтыя пытанні?

Правообладатель Национальный институт образования

## ПАЎТАРЭННЕ

**232.** Прачытайце. У якім сказе заключаецца асноўная думка верша? Чаму людзі славяць хлеб?



**Хле*(б/п)***

**На стале за*(у/ў)*сёды ёс*(т/ц)*ь.**
**Пастаянны ён, не гос*(т/ц)*ь.**
**Яму слава і хвала,**
**бо *(у/ў)*сяму ён галава.**

***М. Маскевіч.***

Спішыце. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс. Падкрэсліце слоўнікавае слова, якое сустрэлася ў вершы.

**233.** Прачытайце. Чаму так гавораць?

**Хлеб — усяму галава.**
**Калі хочаш хлеб мець, то трэба зямліцу глядзець.**

Якая прыказка падыходзіць да верша з практыкавання 232 і дапамагае раскрыць яго асноўную думку? Запішыце яе па памяці.



Правообладатель Национальный институт образования

**234.** Разгадайце рэбус.

Х  ’ Б

Дапоўніце і запішыце сказ.

... — гэта праца многіх людзей.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

Назавіце слова, у якім ёсць зацвярдзелыя зычныя гукі.

**235.** Прачытайце назвы прафесій. Паспрабуйце растлумачыць, што робяць людзі кожнай з гэтых прафесій.

Палявод, камба́йнер, трактарыст, пекар, **мельнік**, прадавец.

Спішыце словы ў алфавітным парадку. Выдзеленае слова падзяліце на склады. Колькі гукаў і колькі літар у гэтым слове?



Правообладатель Национальный институт образования



**236.** Прачытайце верш.

Чорны, белы хлеб ці здобу
еш, але не забывай
быць удзячным хлебаробу,
што вырошчваў ураджай.

*А. Вольскі.*

Назавіце словы, у якіх ёсць зацвярдзелыя зычныя гукі.

Знайдзіце і прачытайце словы, якія абазначаюць прадметы.

**237.** Прачытайце верш. Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.



Но*(ч/чч)*у *(т/ц)*ёплы дождж
прайшоў,
і, як *(д/дз)*еткі каля маткі,
ля стар*(е/э)*нькіх масляко*(у/ў)*
в*(е/я)*сяля́цца масл*(е/я)*няткі.

*В. Гардзей.*

Спішыце, устаўце патрэбныя літары.

Падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккасць папярэдняга зычнага гука.



Правообладатель Национальный институт образования

**238.** Прачытайце верш.

Х..́раша, х..́раша
летам у б..ры —
і грыбы, і ягады
ў пры́гаршчы бяры.

*А. Вольскі.*

Спішыце. Устаўце ***о, э*** або ***а***, растлумачце іх правапіс.

**239.** Расстаўце словы ў патрэбным парадку, каб атрымаліся сказы.







Запішыце сказы. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што гаворыцца.



Правообладатель Национальный институт образования

**240.** Прачытайце верш, правільна вымаўляючы гукі [т], [ц’].



Ве..ер шэпча з каласамі.
Жмура..ь вочы васількі.
Жыта колецца вусамі —
**ас..ярожна**, матылькі!

*Н. Галіноўская.*

Растлумачце, якія вочы ў васількоў і вусы ў жыта. Каго нагадваюць вам васількі, жыта?

Якія літары трэба ўставіць у словы? Растлумачце іх правапіс.

Праверце напісанне выдзеленага слова па арфаграфічным слоўніку.



**241.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Чэрвень. Чарнеюць чарніцы,
і чырванеюць суніцы.

*В. Жуковіч.*

Спачатку назавіце словы з мяккім гукам [ц’], а потым — з зацвярдзелым гукам [ц].

Назавіце словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**242.** Прачытайце верш. Вусна перакладзіце слова *сподак* на рускую мову.

### Лясныя сподачкі

Выраслі ля сце*(ж/ш)*кі
спо*(д/т)*кі-сырае*(ж/ш)*кі,
сподачкі ўсе новыя,
рознакаляровыя.



Смоўж з іх п*(ь/')*е,
і **сойка** п*(ь/')*е.
**Пойдзе** дож*(дж/ч)* —
іх зноў **нал(ь/')е.**

*В. Пчолка.*

Якія літары або знакі трэба ўставіць у словы? Чаму? Спішыце другі слупок верша. Падзяліце выдзеленыя словы для пераносу.

**243.** Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе.

Бяры з сабою нож**ы**к,
гр**ы**бы збірай у кош**ы**к.

*Н. Мікліс.*

Назавіце ў сказе прыназоўнікі. Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



Правообладатель Национальный институт образования

**244.** Прачытайце заклічку. Назавіце словы, якія абазначаюць прыметы прадмета.

Дожджык, дожджык дробненькі,
будзь ты, дожджык, добранькі,
ліся ты ўсю ночку,
каб раслі грыбочкі.

*А. Дзеружынскі.*

Растлумачце правапіс літар ***д, дз***.

## Слоўнікавыя словы

дзве́ры
ёсць
калекты́ў
калідо́р
ле́свіца
меда́ль
метро́
мя́ккі
па́мяць
стадыён
сусе́д
цвёрды
чацве́р



Правообладатель Национальный институт образования

## Спіс выкарыстанай літаратуры

1. *Агняцвет, Э.* Буду настаўнікам / Э. Агняцвет. — Мінск : Юнацтва, 1990.

2. *Агняцвет, Э.* Доктар Смех / Э. Агняцвет. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1977.

3. Беларуская літаратура : пазакласнае чытанне / аўт.-уклад. Л. І. Строк. — Мінск : Юнипресс, 2009.

4. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / склад. : М. Б. Яфімава, В. М. Ляшук. — Мінск : Вышэйшая школа, 2003.

5. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя / аўт.-склад. М. Ф. Шаўлоўская. — Мінск : Юнипресс, 2003.

6. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі; рэд. М. Суднік. — Мінск : АН БССР, 1962.

7. *Буторына, І. А.* Літаратурныя зярняткі, або Развіццё творчых здольнасцей маленькага чытача / І. А. Буторына. — Мінск : Рэдакцыя газеты «Звязда», 2012.

8. *Бялыніцкі-Біруля* : альбом-каталог твораў / склад. А. К. Рэсінай. — Мінск : Беларусь, 1974.

9. *Верашчака, Г. І.* Развіццё маўленчай дзейнасці першакласнікаў / Г. І. Верашчака, Г. М. Федаровіч. — Мінск : Пачатковая школа, 2005.

10. *Вітка, В.* Чытанка-маляванка / Васіль Вітка. — Мінск : Юнацтва, 1998.

11. *Вольскі, А.* Казкі з праўдай напалам / Артур Вольскі. — Мінск : Асар, 1996.

12. Вясёлка, 2006 — 2015.

13. *Галіноўская, Н. В.* Гусіны капялюш / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Юнацтва, 1994.

14. *Галіноўская, Н.* Камп'ютарныя сакрэты : вершы, казкі, жарты, небыліцы, загадкі, смяшынкі, лічылкі, скорагаворкі, пацешкі : для мал. шк. узросту / Н. Галіноўская; маст. Свентахоўскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

15. *Галіноўская, Н. В.* Клубок і калабок / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Юнацтва, 1999.

16. *Гарбук, В. С.* Такіх кветак не бывае / В. С. Гарбук. — Мінск : Беларусь, 1971.

17. *Даніленка, М. П.* Як дажджы памірыліся : апавяданні, казкі : кн. для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Даніленка. — Мінск : Народная асвета, 2013.

18. *Дзеружынскі, А.* Вяселікі / А. Дзеружынскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979.



Правообладатель Национальный институт образования

19. *Дзержынскі, А.* Добры ветрык : выбранае/ А. Дзержынскі. — Мінск : Беларусь, 1969.
20. З любоўю да мовы / склад. : І. А. Гімпель, Г. В. Нарубіна. — Мінск : Беларускі вучэбна-метадычны цэнтр, 1992.
21. *Зуёнак, В.* Сонечны клубочак / В. Зуёнак ; мал. Я. Куліка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1972.
22. *Зэкаў, А. М.* Вожык вёз сараканожак : вершы : для дзяцей мал. шк. узросту / А. М. Зэкаў ; маст. Вікторыя Міронцава. — Мінск : Звязда, 2014.
23. *Зэкаў, А. М.* Кенгуру ці кенгура? : казкі і вершы : для мал. шк. узросту / А. М. Зэкаў. — Мінск : Народная асвета, 2013.
24. *Іпатава, В. М.* Снягурка / В. М. Іпатава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1974.
25. *Карызна, У.* Насціна кніжка : вершы, казкі, загадкі : для дзяцей / У. Карызна ; маст. Г. В. Шапялевіч. — Мінск : Юнацтва, 1995.
26. *Клышка, А.* Тысяча арэшкаў / Анатоль Клышка. — Мінск : Народная асвета, 2012.
27. Крынічка : чытанка / уклад. Р. М. Міронава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009.
28. *Кудлачоў, В. С.* Сонца ранак падарыла / В. С. Кудлачоў. — Гродна : Гродзенская друкарня, 2008.
29. *Лось, Е.* Вяселікі / Е. Лось. — Мінск : Беларусь, 1964.
30. Мама — сонейка маё... / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008.
31. *Мазго, У.* Прыгоды марахода / У. Мазго. — Мінск : Юнацтва, 2002.
32. *Мацвеенка, У. І.* Займальны родны алфавіт: вершы, загадкі, скорагаворкі : для мал. шк. узросту / У. Мацвеенка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 48 с.
33. *Мацвеенка, У. І.* Сябрынка / У. І. Мацвеенка. — Мінск : Юнацтва, 1995.
34. *Муравейка, І.* Вадзіца з крыніцы / І. Муравейка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006.
35. *Мушынская, Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць / Т. М. Мушынская. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2008.
36. *Пазнякоў, М.* Побач з татам / М. Пазнякоў. — Мінск : Юнацтва, 1988.
37. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015.



Правообладатель Национальный институт образования

38. *Пазнякоў, М. П.* У родным краі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. П. Пазнякоў ; маст. Сяргей Волкаў. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2009.

39. *Парукаў, Н. І.* Калючы госць / Н. І. Парукаў. — Мінск : Дзяржвыд БССР, 1963.

40. Пахі вясны / Т. Кляшторная [і інш.]. — Мінск : Юнацтва, 1991.

41. *Прануза, П. К.* Першыя крокі / П. К. Прануза. — Мінск : Юнацтва, 1993.

42. *Прануза, П.* Ручаёк / П. Прануза. — Мінск : Беларусь, 1969.

43. Вясёлыя здарэнні : для дашк. і мал. шк. узросту / П. Рунец. — Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1962.

44. *Рунец, П. М.* Добрая душа / П. М. Рунец. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1977.

45. *Солахаў, А. В.* Падарожжа ад А да Я / А. В. Солахаў. — Мінск : Зорны Верасок, 2012.

46. *Сторажава, Н. А.* Мова мая і твая : вучу дзяцей па-беларуску. Мінск : Выд. А. Ванін, 1993.

47. *Тулупава, Н.* Дожджык Мікіта / Н. Тулупава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1978.

48. Уступны вусны курс / Навук.-даслед. ін-т педагогікі; [падрыхт. М. Г. Яленскі]. — Мінск, 1982.

49. *Хамянкоў, М.* Чаму не спіцца сонцу / М. Хамянкоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007.

50. *Хомчанка, В.* Паклон / В. Хомчанка. — Мінск : Народная асвета, 1976.

51. *Церашкова А.* Вершы-загадкі / А. Церашкова. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012.

52. *Чарняўскі, М. М.* Едзе вожык на кані : прымаўлянкі-забаўлянкі : для дзяцей мал. шк. узросту / М. М. Чарняўскі ; маст. Вольга Якубоўская. — Мінск : Звязда, 2016.

53. *Шах, С. М.* Вучым гаварыць і думаць / С. М. Шах. — Мінск : Народная асвета, 1998.

54. *Шушкевіч, С. П.* Казачны церам / С. П. Шушкевіч. — Мінск : Юнацтва, 1983.

55. *Шушкевіч, С. П.* Выбраныя творы : у 2 т. / С. Шушкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1978. — Т. 1.

56. *Шырын, Л.* Ясь, жалейка і вясна / Л. Шырын. — Мінск : Юнацтва, 1989.

57. *Ягоўдзік, У. І.* Год-карагод / У. І. Ягоўдзік. — Мінск : М. Ягоўдзік, 2013.



Правообладатель Национальный институт образования

# З м е с т

## ГУКІ І ЛІТАРЫ

Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме ........................ 3
Зычныя гукі [д] — [дз’] ................... 10
Зычныя гукі [т] — [ц’] ..................... 17
Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі ........................................ 28
Звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме ........................ 37
Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме ................................. 51
Раздзяляльныя знакі — апостраф *(’)* і мяккі знак *(ь)* ............................. 61

## СЛОВА

Значэнне слова ................................. 77
Словы, якія называюць прадметы ...... 81
Прыназоўнік ...................................... 87
Словы, якія называюць прыметы прадметаў ............................................. 90



Правообладатель Национальный институт образования

Словы, якія называюць дзеянні прадметаў .......................... 96
СКАЗ .................................. 103
ТЭКСТ ................................. 114
ПАЎТАРЭННЕ ........................ 132
Слоўнікавыя словы ..................... 138
*Спіс выкарыстанай літаратуры* ..... 139

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Свірыдзенка** Вольга Іванаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з рускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 2

Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*. Вокладка мастака *З. П. Болцікавай*.
Мастакі *З. П. Болцікава, Я. В. Грышаева, Н. А. Хромава*.
Камп'ютарная вёрстка *І. У. Шутко*.
Карэктары *В. М. Паўлючэнка, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 05.10.2020. Фармат 70×90/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 3,8. Тыраж 128 490 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

## ЦВЁРДЫЯ І МЯККІЯ ЗЫЧНЫЯ ГУКІ

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [в] | [л] | [м] | [н] | [б] | [п] | [г] | [х] | [з] | [с] | [к] | [ф] |
| [в’] | [л’] | [м’] | [н’] | [б’] | [п’] | [г’] | [х’] | [з’] | [с’] | [к’] | [ф’] |

[ў] — цвёрды гук

[й’] — мяккі гук

| | | |
|---|---|---|
| [д] | д | а, о, у, ы, э |
| [т] | т | |

| | | |
|---|---|---|
| [дз’] | дз | е, ё, ю, я, і, ь |
| [ц’] | ц | |

| | | |
|---|---|---|
| [р] | р | а, о, у, ы, э |
| [ж] | ж | |
| [ш] | ш | |
| [ч] | ч | |
| [дж] | дж | |
| [ц] | ц | |

## ПАРНЫЯ ЗВОНКІЯ І ГЛУХІЯ ЗЫЧНЫЯ ГУКІ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| [б] | [б’] | [г] | [г’] | [д] | [дз’] | [з] | [з’] | [ж] | [дж] |
| [п] | [п’] | [х] | [х’] | [т] | [ц’] | [с] | [с’] | [ш] | [ч] |

# СЛОВА

## Словы, якія называюць прадметы

**хто?**
дзяўчынка, хлопчык

**што?**
школа, падручнік

## Словы, якія называюць прыметы прадметаў

**які?**
вясёлы

**якая?**
вясёлая

**якое?**
вясёлае

**якія?**
вясёлыя

## Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

**што раблю?**
вучу
**што робіш?**
вучыш
**што робіць?**
вучыць

**што робім?**
вучым
**што робіце?**
вучыце
**што робяць?**
вучаць

**што зрабіў?**
вывучыў
**што зрабіла?**
вывучыла
**што зрабілі?**
вывучылі

**што рабіў?**
вучыў
**што рабіла?**
вучыла
**што рабілі?**
вучылі

**што зраблю?**
вывучу
**што зробіш?**
вывучыш
**што зробіць?**
вывучыць

**што зробім?**
вывучым
**што зробіце?**
вывучыце
**што зробяць?**
вывучаць

**што буду рабіць?**
буду вучыць
**што будзеш рабіць?**
будзеш вучыць
**што будзе рабіць?**
будзе вучыць

**што будзем рабіць?**
будзем вучыць
**што будзеце рабіць?**
будзеце вучыць
**што будуць рабіць?**
будуць вучыць